ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ

# MEDIAToolkit: практыкаванні для фармавання медыяпісьменнасці

Мінск

Выдавец Уладзімір Сіўчыкаў

УДК 37.091.3:004(06)
ББК 74.026.843я431
М 46

Рэдактар *Тамара Мацкевіч*

Укладанне *Лера Сом*

Прадмова *Алена Радзевіч*

М46 MediaToolkit: практыкаванні для фармавання медыяпісьменнасці. — Мінск : Выдавец Уладзімір Сіўчыкаў, 2020. — 100 с. : іл.

ISBN 978-985-7030-79-8.

MediaToolkit — зборнік практыкаванняў для развіцця медыяпісьменнасці. У яго ўвайшлі тыя практыкаванні, якія дапамагаюць настаўнікам на прыкладзе медыятэкстаў патлумачыць вучням змест урока, а разам з тым даюць адказ на шмат іншых пытанняў, важных для жыцця ў інфармацыйным грамадстве. Як адрозніць фэйк ад праўды? Як праверыць надзейнасць крыніц інфармацыі? Ці можна давяраць рэкламе? Чаму адна і тая падзея выклікае розную рэакцыю ў людзей? Што рабіць, калі цябе троляць? Як не заблытацца ў сацыяльных сетках і не стаць ахвярай кібербулінгу?

Зборнік змяшчае практыкаванні для розных прадметаў і ўзросту навучэнцаў. Іх стварылі самі настаўнікі — ментары і ўдзельнікі дыстанцыйных курсаў ТБШ «Медыяадукацыя ў школе» 2017–2020 гг. Урокі, класныя і інфармацыйныя гадзіны, выхаваўчыя мерапрыемствы з медыяадукацыйным зместам дапамогуць развіць крытычнае мысленне і засвоіць практычныя навыкі бяспечнага і адказнага карыстання медыйнай прасторай.

Дапаможнік будзе карысны кіраўнікам устаноў адукацыі, педагогам пачатковых, сярэдніх і старэйшых класаў, метадыстам, кіраўнікам метадычных аб'яднанняў, бацькам.

**УДК 37.091.3:004(06)**
**ББК 74.026.843я431**

**ISBN 978-985-7030-79-8**

© Таварыства беларускай школы, 2020
© Афармленне. Выдавец Уладзімір Сіўчыкаў, 2020

# НАМ ЁСЦЬ ЧАМУ ВУЧЫЦЦА АДЗІН У АДНАГО

Дапамагаючы настаўніку вучыць, мы дапамагаем вучню вучыцца — вось што ляжыць у аснове практыка-арыентаванага метадычнага дапаможніка па медыяадукацыі. Распрацаваныя і сабраныя лепшымі педагогамі-практыкамі і метадыстамі практыкаванні дапамогуць вам павысіць свой прафесійны ўзровень у галіне развіцця ў вучняў найважнейшых кампетэнцый XXI стагоддзя — медыяпісьменнасці і крытычнага мыслення, што дапаможа вучням арыентавацца ў моры інфармацыі і ўпэўнена крочыць у будучыню з яе новымі тэхналогіямі і медыя-інфармацыйным асяроддзем.

Дапаможнік па арганізацыі ўрокаў з медыяадукацыйнай накіраванасцю з'яўляецца друкаванай версіяй MediaToolkit, з якім вы можаце пазнаеміцца і актыўна карыстацца па спасылцы http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/

Згрупіраваныя па катэгорыям, узроставым групам і тэмам практыкаванні дапамогуць арганізаваць сучасныя інтэрактыўныя ўрокі па розных прадметах і класах, пазаўрочныя мерапрыемствы, дзякуючы карысным стратэгіям і навукова абгрунтаваным падыходам да вядзення ўрокаў. Аўтары практыкаванняў падабралі для дзяцей цікавыя прыклады, падрыхтавалі дапаможныя матэрыялы для заняткаў: карысныя спасылкі, публікацыі ў СМІ і метадычныя рэкамендацыі для калег.

Мы ўпэўненыя, што гэты дапаможнік пашырыць ваш педагагічны арсенал і дасць шмат цікавых ідэй, якімі зможаце падзяліцца з калегамі.

Дапаможнік будзе карысны кіраўнікам устаноў адукацыі, педагогам пачатковых, сярэдніх і старэйшых класаў, метадыстам, кіраўнікам метадычных аб'яднанняў, бацькам.

Дзякуем за ідэю стварэння тулкіта міжнароднаму праекту Medianavigator.org: https://medianavigator.org/

Дасылайце вашыя практыкаванні і прапановы на адрас: nastaunik.info@gmail.com

Сачыце за навінамі ў суполцы ў Facebook «Медыяадукатар»: https://www.facebook.com/groups/medyaadukatar/

*Алена РАДЗЕВІЧ, начальнік* цэнтра прафесійнага развіцця і інавацыйнай адукацыі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі.

# ПАЧАТКОВАЯ ШКОЛА

## ЖЫЦЦЁ ДЗІКІХ ЖЫВЁЛ ЗІМОЙ

***Медыякампетэнцыі:*** Праверка надзейнасці крыніц інфармацыі. Пошук інфармацыіі

Клас 1
***Прадмет:*** Чалавек і свет
***Тэма ўрока:*** Зімоўка жывёл

***Мэта занятка:***

Дзеці пазнаёмяцца з інфармацыяй з розных крыніц пра зімоўку жывёл: роліка YouTube, верша і падручніка; растлумачаць, чаму звяры маюць розныя спосабы зімоўкі; зразумеюць, што інфармацыя ў розных крыніцах можа быць рознай і яе трэба правяраць.

***Ход заняткаў:***

Чытаецца верш:

Опустел холодный лес,
Замер понемногу:
Кто в норе, а кто залез
В зимнюю берлогу.

Снится мишкам молодым
Мед душистый, свежий.
Отощала без еды
Вся семья медвежья.

Арганізуецца гутарка, аб кім ідзе размова ў прапанаваным вершы. Настаўнік паведамляе, што зараз вучні даведаюцца, як рыхтуюцца да зімоўкі гэтыя звяры. Затым арганізуецца прагляд часткі відэароліка пра мядзведзя. Пасля прагляду відэа настаўнік задае пытанні:

• Як рыхтуецца мядзведзь да зімоўкі?
• Чаму мы не ўбачым мядзведзя ў зімовым лесе?

Настаўнік абагульняе адказы вучняў, затым задае праблемнае пы-

танне: як бачым з відэа, мядзведзь назапашвае ежу сабе на зіму. Чаму ж тады ў вершы, які я вам чытала на пачатку ўрока, ёсць такія радкі:

Снится мишкам молодым
Мед душистый, свежий.
Отощала без еды
Вся семья медвежья.

Пытанне абмяркоўваецца ў парах. Адказы могуць быць наступныя: запасаў было мала і яны закончыліся; не ўсе мядзведзі зрабілі запасы. Для пошуку правільнага адказу на гэтае пытанне можна звярнуцца да артыкула «Книги для чтения» для 1 класа «Почему у большой медведицы рождаются маленькие медвежата?». Далей трэба пагутарыць па супастаўленні пачутага з відэаролікам. Вучні прыходзяць да высновы, што ў роліку пададзена недакладная інфармацыя і інфармацыю трэба правяраць. Да той жа высновы вучні прыходзяць пры знаёмстве з інфармацыяй пра вожыка. Як варыянт, настаўнік распавядае, што крыніцы інфармацыі бываюць надзейнымі: напрыклад, навуковыя артыкулы, энцыклапедыі, слоўнікі і зачытвае адтуль звесткі.

Спасылкі:
https://www.youtube.com/watch?v=evCTHItcMcc
https://www.youtube.com/watch?v=USYQbwxYzRc

***Парада:***
Можна звярнуць увагу вучняў на розную стылістыку тэкстаў, з якіх яны атрымліваюць інфармацыю, і падкрэсліць, што мастацкія творы маюць за мэту не данясенне інфармацыі, а стварэнне мастацкага вобраза.

***Аўтар:*** Наталля Казак

Спасылка на практыкаванне на сайце:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/16815

# ПОЧВА. СВОЙСТВА ПОЧВЫ

*Медыякампетэнцыі:* Праверка надзейнасці крыніц інфармацыі. Пошук інфармацыіі

Клас 2
*Прадмет:* Чалавек і свет
*Тэма ўрока:* Почва. Свойства почвы

*Мэта занятка:*
В процессе изучения информации из разных источников (видеоролика, информации из Интернета, учебника), учащиеся смогут больше узнать о составе почвы, понять, что информация из различных источников может отличаться и умение находить информацию является очень полезным навыком в жизни.

*Ход заняткаў:*
Класс делится на три группы. Каждая группа получает таблицу для заполнения и задание.
Задание для 1-й группы: прочитать материал учебника «Человек и мир», 2 класс, «Почва». Заполнить предложенную таблицу.
Задание для 2-й группы: посмотреть видеоролик «Опыты с водой». Заполнить предложенную таблицу.
Задание для 3-й группы: прочитать (онлайн) статью «Как «растёт» почва». Заполнить предложенную таблицу.
После выполнения задания, каждая группа представляет информацию, которую удалось получить. Оказывается, информация разнится.
Ученики делают вывод, что информация из различных источников отличается. Используя только один источник информации, группы не смогли заполнить всю таблицу.
После дискуссии с учащимися выясняется, что использование различных источников помогает получить больший объём информации, что информация может быть неполной, неточной, и что умение находить информацию является очень полезным в жизни навыком.

Спасылкі:
Табліца: https://drive.google.com/open?id=1qFFuVnDAuz1oz3D4u7yiYW61wRJFvtx4
Відэа «Як расце глеба»: http://www.minipedia.org.ua/kak-rastet-pochva/
Відэа «Вопыт з вадой і глебай»: https://www.youtube.com/watch?v=mJUvJNnH4Jo&t=4s

*Парады:*

В качестве дополнительного (творческого) домашнего задания можно предложить детям найти еще информацию по данной теме (энциклопедии, справочники, интернет). На следующем уроке учащиеся представляют найденную ими информацию. Это прекрасная возможность увидеть, услышать и понять, что информация разная и не всегда верная. А ученики смогут сделать вывод, что информацию нужно проверять.

*Аўтар:* Ірына Шлемянкова

Спасылка на практыкаванне на сайце:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17285

## АД БАТЛЕЙКІ ДА ПАЛАНЭЗА

*Медыякампетэнцыі:* Аналіз медыя. Дэкадаванне медыятэкстаў

Клас 4
*Прадмет:* Чалавек і свет
*Тэма ўрока:* Ад батлейкі да паланэза

*Мэта занятка:*

Вучыць дзяцей дэкадаваць відэа, адбіраць найбольш важныя факты.

*Ход заняткаў:*

У працэсе ўрока дзеці пасля праслухоўвання музыкі і прагляду відэа адказваюць на пытанні, аналізуюць відэаролік, выказваюць свае меркаванні з нагоды назвы паланэзу, даведваюцца, што гісторыя краіны і яе мастацтва заўсёды звязаныя.

Спасылка:
https://www.youtube.com/watch?v=pzuFPOwNJkI&list=PLHUxJHwmpBTMLZnhIrwszuu4Iz6wWLHcF&index=9

*Парады:*

Вучні аналізуюць паланэз Агінскага і яго назву. Знаёмяцца з мовай музыкі, як сродка для перадачы пачуццяў слухачу. Усведамля-

юць, што гістарычныя падзеі могуць уплываць на мастацтва: Падзел Рэчы Паспалітай (поўная назва Рэспубліка двух народаў) пазбавіў беларускія землі сваёй дзяржаўнасці і незалежнасці, і гэта адлюстравалася ў мастацтве. Назва паланэзу «Развітанне з Радзімай» адлюстроўвае пачуцці беларусаў у той час: гэта трывожны і сумны твор, аднак не пазбаўлены надзеі.

*Аўтар:* Святлана Сяргеева

Спасылка на практыкаванне на сайце:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/16844

# М О В А

## ТВОРЧЫЯ ДАМАШНІЯ ЗАДАННІ

*Медыякампетэнцыі:* Пошук інфармацыіі. Стварэнне, апрацоўка, прэзентацыя медыяпаведамлення

Клас 5–11
*Прадмет:* Беларуская мова
*Тэма ўрока:* Любая

*Мэта занятка:*
Навучыць дзяцей ствараць якасныя медыяпрадукты.

*Ход заняткаў:*
Вучні атрымліваюць дамашняе заданне на выбар: звычайнае ці творчае. Творчае заданне можа быць звязанае з тым, што вучні любяць рабіць: здымаць відэа, весці блогі, гатаваць ежу, граць на музычных інструментах, спяваць...

Творчыя заданні маюць форму медыяпраектаў і выкладаюцца ў асобную суполку ў сацыяльных медыя. Суполка можа быць як закрытая, так і адкрытая. Дамашнія заданні могуць выконвацца як у групах, так і індывідуальна.

Творчыя дамашнія заданні адкрытыя для абмеркаванняў, ацэнкі, узаемаацэнкі і іншых форм работы.

Варыянты творчых заданняў:

1) 5 клас. Беларуская мова. Лексіка абмежаванага ўжытку. Стварыць медыяпраект у любым жанры з ужываннем лексікі абмежаванага ужытку.

2) 5 клас. Простая мова. Дыялог. Інтанаванне сказаў з простай і дыялагічнай мовай. Вусны падрабязны пераказ тэксту (дамашняе заданне) з простай мовай.

3) 6 клас. Стылі маўлення. Падрыхтоўка вуснага віншавання.

4) 7 клас. Беларуская мова. Ужыванне прыслоўяў у вусным маўленні. Стварыць медыяпраект у любым жанры з ужываннем прыслоўяў.

5) 10 клас. Лексіка. Аналіз газетнага артыкула з пункту гледжання адпаведнасці лексічным нормам.

Спасылкі:
З прыкладамі выканання творчых зананняў можна пазнаёміцца тут:
https://vk.com/public159779044
http://www.nastaunik.info/node/16647

***Парады:***

Пры абмеркаванні вучнёўскіх работ ствараць атмасферу добразычлівасці, падкрэсліваць, што медыястваральнікамі можа быць любы з іх, кожны ў сваёй сферы.

***Аўтар:*** Алена Панкратава

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/16843

## ГЛЯДЗІ Ў КОРАНЬ! (АДНАКАРАНЁВЫЯ СЛОВЫ)

***Медыякампетэнцыі:*** Вызначэнне жанраў медыя. Разуменне мовы медыя, функцыі рэкламы

Клас 6
***Прадмет:*** Беларуская мова
***Тэма ўрока:*** Корань слова. Аднакаранёвыя словы

*Мэта занятка:*

Навучыцца вычляняць інфармацыю з відэа.

*Ход заняткаў:*

На вучэбным занятку беларускай мовы ў 6 класе пры вывучэнні тэмы «Корань слова. Аднакаранёвыя словы» вучні глядзяць рэкламу квасу «Хатні». У роліку пад відэашэраг сялянскага жыцця гучыць тэкст:

— Эх, смаката!

— Смачненька!

— Як смачна!

— Можна по-рознаму апісаць смак квасу «Хатні». Але чым казаць, лепш пасмакаваць!

— Квас «Хатні». Смачна піць!

Вучням даецца заданне выпісаць аднакаранёвыя словы, вызначыць у іх корань. Шасцікласнікі ўспрымаюць заданне як гульню, выконваюць яго з цікавасцю, з лёгкасцю, таму што медыятэкст яркі, вобразны, запамінальны.

На гэтым жа занятку на этапе замацавання вуням паказваецца рэкламны плакат «Час пачаставацца «Мівінай».




Вучні вызначаюць, што словы «час» і «пачаставацца», хоць і маюць аднолькавую частку «час», нельга аднесці да аднакаранёвых, паколькі яны не аб’яднаныя агульным лексічным значэннем. Пасля праведзенай работы вучні адказваюць на пытанні:

- Якім адным словам вы можаце назваць ролік і плакат? (рэклама)
- Для чаго ствараюць рэкламу? (каб прадаць тавар ці паслугі)
- Навошта выкарыстоўваюць у рэкламе сугучныя і аднакаранёвыя словы? (каб прыцягнуць увагу і каб тавар асацыяваўся з нечым прыемным і запамінальным)

• Ці заўсёды ў рэкламе мы бачым праўдзівую інфармацыю і чаму?

Спасылкі:
https://youtu.be/7Vi7enVI7kE
https://vk.com/mivinabel

***Парады:***

Упэўненая, што настаўнік-прадметнік зможа прыстасаваць калі не кожны від медыя, то хаця б выбарачна пад свой прадмет, пад тэму вучэбнага занятка ў любым класе. А творчы настаўнік можа скамбініраваць некалькі відаў медыя на адным вучэбным занятку.

***Аўтар:*** Алена Саўчанка

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17102

# ЛІТАРАТУРА

## ТВОРЧЫЯ ДАМАШНІЯ ЗАДАННІ

***Медыякампетэнцыі:*** Пошук інфармацыіі. Стварэнне, апрацоўка, прэзентацыя медыяпаведамлення

Клас 5–11
***Прадмет:*** Беларуская літаратура
***Тэма ўрока:*** Любая

***Мэта занятка:***
Навучыць дзяцей ствараць якасныя медыяпрадукты

***Ход заняткаў:***

Вучні атрымліваюць дамашняе заданне на выбар: звычайнае ці творчае. Творчае заданне можа быць звязанае з тым, што вучні лю-

бяць рабіць: здымаць відэа, весці блогі, гатаваць ежу, граць на музычных інструментах, спяваць.

Творчыя заданні маюць форму медыяпраектаў і выкладаюцца у асобную суполку ў сацыяльных медыя. Суполка можа быць як закрытая, так і адкрытая. Дамашнія заданні могуць выконвацца як у групах, так і індывідуальна.

Творчыя дамашнія заданні адкрытыя для абмеркаванняў, ацэнкі, узаемаацэнкі і іншых форм работы.

Варыянты творчых заданняў:

1. Стварыць медыятэкст «Вершы на асфальце» паводле газеты «Звязда». Формы работы: Пошук інфармацыіі ў СМІ, сціслы пераказ, відэазапіс, візуалізацыя, класіфікацыя сказаў.

2. XI клас. Беларуская літаратура. Медыяпраект па аповесці Святланы Алексіевіч «У вайны не жаночае аблічча».

3. 8 клас. Беларуская літаратура. Караоке песні «Спадчына» на словы Янкі Купалы.

Спасылкі:
https://vk.com/public159779044
http://www.nastaunik.info/node/16647

***Парады:***

Пры абмеркаванні вучнёўскіх работ заўсёды ствараць атмасферу добразычлівасці, падкрэсліваць, што медыястваральнікамі можа быць кожны з іх, кожны ў сваёй сферы.

***Аўтар:*** Алена Панкратава

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/16843

## СТАРОНКА ГЕРОЯ

***Медыякампетэнцыі:*** Фармаванне вобраза на старонцы сацсеткі. Бяспека ў сеціве

Клас 5–9
***Прадмет:*** Беларуская літаратура
***Тэма ўрока:*** Характарыстыка літаратурнага героя

*Мэта занятка:*

Паказаць вучням небяспеку неабачлівых паводзін у сацыяльных сетках

*Ход заняткаў:*

Вучні робяць характарыстыку літаратурнага героя праз стварэнне яго(яе) старонкі ў сацыяльнай сетцы, ўдасканальваюць свае ўменні работы з тэкстам, задумваюцца над тым, што інфармацыя на старонцы сацсеткі выдае іншым карыстальнікам пэўны вобраз, разважаюць над тым, што не ўсю інфармацыю трэба выкладаць у інтэрнэт.

Работа можа праводзіцца на ўроку групай, індывідуальна як дамашняе заданне. Сетка «У кантакце» выбрана таму, што з'яўляецца найбольш папулярнай ў падлеткаў.

Сутнасць задання ў тым, каб запоўніць старонку найбольш поўна на аснове тэкста твора і патлумачыць кожны пункт. Напрыклад, у Сержа з «Насцечкі» Кузьмы Чорнага можа быць у «цікавасцях» «машыны», таму што ён час ад часу пад'язджае да школы на бацькавым аўто.

Запоўненыя акаўнты параўноўваюцца. Абмяркоўваецца, ці можам мы па інфармацыі, пададзенай у акаўнце, глыбока зразумець характар чалавека, ці бяспечна падаваць усе звесткі ў акаўнце.

Спасылкі:
https://drive.google.com/open?id=19YBovm79YHaouu9tCfWLHhwZd53JGNYh

*Парады:*

Варта абавязкова нагадваць вучням пра тое, што старонкі запаўняюцца менавіта па тэксце твора. Вучні 5–6 класаў часта схільныя адштурхоўвацца ад агульнага ўражання пра героя.

*Аўтар:* Лера Сом

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17239

## УРЫВАК З ПАЭМЫ Л. СЛУЧАНІНА «РАГНЕДА». ВОБРАЗ РАГНЕДЫ

*Медыякампетэнцыі:* Праверка надзейнасці крыніц інфармацыі. Праверка даставернасці (Фактчэкінг). Дэкадаванне медыятэкстаў

Клас 6
*Прадмет:* Беларуская літаратура
*Тэма ўрока:* Урывак з паэмы Л. Случаніна «Рагнеда». Вобраз Рагнеды

*Мэта занятка:*

Практыкванне дапамагае стварыць больш разгорнуты вобраз Рагнеды на аснове медыятэкстаў (стопкадры з фільма Андрэя Краўчука «Вікінг»); вучыць навучэнцаў крытычна ставіцца да інфармацыі, атрыманай з мастацкага фільма; тлумачыць, што вобраз, створаны рэжысёрам, не заўсёды адпавядае гістарычным рэаліям.

*Ход заняткаў:*

Славутая гісторыя Полацкага княства кранае сэрцы многіх таленавітых пісьменнікаў, скульптараў, жывапісцаў, рэжысёраў. Але ў кожнага Рагнеда выступае не толькі прыгожай, але смелай і мужнай, годнай і незалежный палачанкай, адданай свайму народу. У 2016 годзе расійскім рэжысёрам Андрэем Краўчуком быў зняты фільм «Вікінг». У аснову гэтай гістарычный драмы была пакладзена гісторыя князя Уладзіміра. Ролю Рагнеды выканала беларуская актрыса Аляксандра Борціч. Паглядзіце ўважліва на кадры з фільма і паспрабуйце стварыць слоўны партрэт князёўны, карыстаючыся атрыманай раней інфармацыяй.

Вучні ствараюць сінквейн, працуючы ў групах па 2 чалавекі:
Ключавое слова: Рагнеда
Два прыметнікі: ________________________________
Тры дзеясловы: ________________________________
Фраза з чатырох слоў ________________________________
Сінонім да ключавога слова ________________________________

Праца па пытаннях:

— Якой вы бачыце Рагнеду на гэтых здымках?

— Што яна робіць?

— Чаму яна гэта робіць?

— Ці адпавядае створаны рэжысёрам вобраз князёўны вобразу, апісанаму ў літаратурных творах?

— Ці магла дачка князя мець такую прычоску? Што ў старажытнасці сімвалізавалі распушчаныя валасы?

— Ці адпавядае адзенне Рагнеды ўбору князёўны ў час сватання да яе князя Уладзіміра?

— Ці не падалося вам, што гэты вобраз значна больш адпавядае модным тэндэнцыям XXI, а не X стагоддзя?

— Як вы лічыце, ці павінны мастацкія фільмы, створаныя на аснове гістарычных падзей, адпавядаць рэаліям таго часу?

— Як глядач павінен ставіцца да мастацкіх фільмаў на аснове гістарычных падзей?



Спасылка:
https://24smi.org/celebrity/4845-rogneda-rogvolodovna.html

***Парад:***

Можна паказаць вучням і іншыя вобразы Рагнеды, створаныя мастакамі ў розныя часы.

*Аўтар:* Юлія Некраш

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17234

# ПАРАЎНАЛЬНЫ АНАЛІЗ ВОБРАЗА РАГНЕДЫ НА ПРЫКЛАДЗЕ ТВОРАЎ ЛІТАРАТУРЫ І ЮБІЛЕЙНАЙ МАНЕТЫ

*Медыякампетэнцыі:* Пошук інфармацыіі. Аналіз інфармацыі

Клас 6

*Прадмет:* Беларуская літаратура

*Тэма ўрока:* «Параўнальны аналіз вобраза Рагнеды на прыкладзе твораў Л. Случаніна «Рагнеда» і Ул. Бутрамеева «Славутая дачка Полацкай Зямлі»

*Мэта занятка:*

Пазнаёміць навучэнцаў з рознымі відамі медыятэкстаў, вучыць навучэнцаў аналізаваць інфармацыю і ўмець яе прымяняць.

*Ход заняткаў:*

Настаўнік задае вучням пытанні:

— Падумайце, навошта нам параўноўваць гэтыя творы? Павярніцеся адзін да аднаго і абмяркуйце разам гэта пытанне (1 хвіліна)

— А цяпер агучым вашы меркаванні (5–6 вучняў даюць свае адказы, выкарыстоўваецца прыем «непадымання рукі»)

Пасля выразнага чытання тэксту Ул. Бутрамеева адбываецца гутарка па пытаннях, змешчаных у падручніку і аналіз рэпрадукцыі карціны В. Дударэнкі «Рагнеда і Ізяслаў» (размешчана ў падручніку «Беларуская літаратура. 6 клас»).

Настаўнік пытаецца ў вучняў, дзе яшчэ можна сустрэць выяву Полацкай князёўны (помнікі архітэктуры, творы жывапісу).

Праца з медыятэкстам:

Вучням дэманструецца беларуская юбілейная памятная манета «Рагвалод Полацкі і Рагнеда» Нацыянальнага банка Беларусі, уведзеная ў абарачэнне 9 лістапада 2006 года.

— Ці з'яўляецца гэта манета медыятэкстам?

— Якую інфармацыю мы можам атрымаць, гледзячы на манету?

— Абмяркуйце ў парах выяву на гэтай манеце, сфармулюйце і запішыце 6 сказаў (заданняў) да гэтай выявы. Заданні павінны пачынацца наступнымі словамі:

Чаму...

Назаві...

Растлумач...
Прапануй...
Прыдумай...
Падзяліся...

Пры дапамозе кубіка Блума вучні агучваюць запісаныя сказы. Робяць выснову, што манеты і грашовыя купюры таксама з›яўляюцца медыятэкстам, бо змяшчаюць у сабе інфармацыю і пасыл.

Спасылка:
https://be-tarask.m.wikipedia.org/wiki/%D0%A0%D0%B0%D0%B3%D0%B2%D0%B0%D0%BB%D0%BE%D0%B4_%D0%9F%D0%BE%D0%BB%D0%B0%D1%86%D0%BA%D1%96_%D1%96_%D0%A0%D0%B0%D0%B3%D0%BD%D0%B5%D0%B4%D0%B0_(%D0%BC%D0%B0%D0%BD%D1%8D%D1%82%D0%B0)

***Парады:***

На пачатку практыкавання настаўнік дэманструе вучням памятную юбілейную манету «Рагвалод Полацкі і Рагнеда». Пытаецца, ці з'яўляецца яна крыніцай інфармацыі? Гэты прыём можна выкарыстаць у якасці кручка, які дапаможа зацікавіць вучняў тэмай, выйсці на дэталёвы аналіз вобраза Рагнеды

***Аўтар:*** Юлія Некраш

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17228

## ФАКТЫ І МЕРКАВАННІ Ў НАШЫХ ПАДРУЧНІКАХ

***Медыякампетэнцыі:*** Праверка надзейнасці крыніц інфармацыі. Уменне адрозніць факты ад меркаванняў. Дэкадаванне медыятэкстаў

Клас 9
***Прадмет:*** Беларуская літаратура
***Тэма ўрока:*** Вывучэнне біяграфіі пісьменніка

***Мэта занятка:***

Пры выкананні практыкавання дзевяцікласнікі навучацца адрозніваць факты ад меркаванняў, аналізуючы артыкулы падручніка па літаратуры (біяграфію пісьменніка).

*Ход заняткаў:*

Вучням даецца заданне прааналізаваць артыкул з біяграфіяй пісьменніка, запаўняючы табліцу на два слупкі. У першы пішуцца факты, якія ёсць у артыкуле, у другі — меркаванні.

У першы слупок павінны папасці дата і месца нараджэння, месца вучобы, першая публікацыя і да т. п. У другі — вызначэнні тыпа «вялікі пясьняр», «выбітны празаік», «маральны сімвал цэлага пакалення» і г.д.

Далей ацэньваецца слушнасць меркаванняў з пункту гледжання ўласнага вопыту вучняў, абмяркоўваецца значнасць уласнага погляду пры стаўленні нават да хрэстаматыйных твораў і аўтараў.

Пры варыянце параўнання артыкулаў з розных падручнікаў можна адсочваць таксама падбор аўтарамі тых ці іншых фактаў з біяграфіі пісьменніка. Пры наяўнасці інтэрнэту можна замест падручніка разглядаць артыкулы з розных сайтаў, адзначыць праўдзівасць інфармацыі ў параўнанні з іншымі крыніцамі.

Спасылкі:

1. https://be-tarask.wikipedia.org/wiki/%D0%9C%D0%B0%D0%BA%D1%81%D1%96%D0%BC_%D0%91%D0%B0%D0%B3%D0%B4%D0%B0%D0%BD%D0%BE%D0%B2%D1%96%D1%87
2. https://bagdanovichmuseum.by/biyagrafiya/

*Парады:*

Групам вучняў можна выдаць падручнікі розных аўтараў і розных гадоў і параўнаць выніковыя табліцы.

*Аўтар:* Лера Сом

Спасылка на практыкаванне на сайце:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17231

## ТАРАС НА ПАРНАСЕ

*Медыякампетэнцыі:* Дэкадаванне медыятэкстаў

Клас 9
*Прадмет:* Беларуская літаратура
*Тэма ўрока:* «Тарас на Парнасе»

*Мэта занятка:*

Удасканальваць уменні вучняў дэкадаваць медыятэкст.

*Ход заняткаў:*

Пры вывучэнні ў 9 класе паэмы «Тарас на Парнасе» спалучаюцца розныя віды медыя. Выконваючы індывідуальныя апераджальныя заданні, вучні, дзякуючы медыяпаведамленням, высвятляюць, што гара Парнас, на іх здзіўленне, не прыдуманая, а рэальная, яна знаходзіцца ў Грэцыі, пацверджваюць гэта фотаздымкамі і паведамленнямі з галіны геаграфіі. Займаючыся пытаннем аўтарства, віртуальна даследуюць і месца знаходжання скульптурных помнікаў у Гарадку. Візуальна ўявіць апісаныя ў творы падзеі дапамагае відэафрагмент спектакля «Тарас на Парнасе», пастаўленага па сцэнарыі Сяргея Кавалёва Беларускім рэспубліканскім тэатрам юнага гледача. Прадстаўлены вучнямі відэасюжэт праграмы «Панарама» (тэлеканал «Беларусь 1») выклікае ў дзевяцікласнікаў абурэнне (яны ўключаюцца ў актыўнае абмеркаванне дэмантажу скульптуры).

Вучням можна прапанаваць знайсці інфармацыю пра далейшы лёс скульптуры у якасці дамашняга задання.

У класе абмяркоўваецца пытанне пра ролю медыя. Які б быў лёс скульптуры, каб пра яе не напісалі, не знялі сюжэт?

Спасылкі:
https://youtu.be/Bqh173TUfv4
https://youtu.be/yR-HbyysIIO

*Аўтар:* Алена Саўчанка

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17103

## ШУКАЕМ ТВАРЫ

*Медыякампетэнцыі:*

Пошук інфармацыіі. Стварэнне, апрацоўка, прэзентацыя медыяпаведамленняў

Клас 9
*Прадмет:* Беларуская літаратура

*Тэма ўрока:* Вывучэнне біяграфіі пісьменніка

*Мэта занятка:*
Паглыбіць веды вучняў па беларускай літаратуры, удасканаліць іх уменне пошуку інфармацыі.

*Ход заняткаў:*
Заданне палягае ў прапанове стварыць біяграфію пісьменніка ў выглядзе шэрагу фотаздымкаў. Можна нагадаць вучням пра тое, што фатаздымкі пісьменнікаў яны могуць адшукаць не толькі ў інтэрнэце, але і ў даведніках, манаграфіях, энцыклапедыях. Клас падзяляецца на некалькі груп, кожная група рыхтуе прэзентацыю па выніках сваіх росшукаў. Групы паказваюць і каментуюць вынікі сваёй работы.

Спасылка:
https://www.google.com/search?q=%D0%BC%D0%B0%D0%BA%D1%81%D1%96%D0%BC+%D0%B1%D0%B0%D0%B3%D0%B4%D0%B0%D0%BD%D0%BE%D0%B2%D1%96%D1%87&source=lnms&tbm=isch&sa=X&ved=2ahUKEwi6npThm7boAhWvk4sKHXhkBisQ_AUoAXoECBgQAw&biw=1536&bih=674&dpr=1.25

*Парада:* Варта даваць гэта заданне перад урокам вывучэння біяграфіі пісьменніка.

*Аўтар:* Лера Сом

Спасылка на практыкаванне: http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17237

## ЗНАЙДЗІ ЦЫТАТУ — АДГАДАЙ АЎТАРА. А. ХАДАНОВІЧ «ГАТЭЛЬ БЕЛАРУСЬ»

*Медыякампетэнцыі:* Пошук інфармацыіі. Дэкадаванне медыятэкстаў. Распазнаванне маніпуляцый

Клас 11
*Прадмет:* Беларуская літаратура
*Тэма ўрока:* Урок-абагульненне, урок пазакласнага чытання

*Мэта занятка:*

Вучні даведаюцца, што ў сучаснай літаратуры (і ў мастацтве ўвогуле) часта выкарыстоўваецца яўнае і схаванае цытаванне, якое можа пераследваць розныя мэты.

*Ход заняткаў:*

Вучням прапануецца тэкст песні А.Хадановіча «Гатэль Беларусь» (на музыку групы The Eagles «Hotel California») і прадстаўляецца музычны запіс. Пасля праслухоўвання неабходна запісаць аўтараў і творы, якія ўзгаданы выканаўцам у гэтай музычнай кампазіцыі. Вучні запаўняюць табліцу «Аўтар/ Назва мастацкага твора» і здаюць на праверку.

Тэкст:

Дзе мой край — там, дзе песню Белавежа пяе,
Сонца ў нашым ваконцы распускае косы свае.
Ён за пушчай, за лесам, за балотам з дрыгвой,
Паміж Польшчаю і Расіяй, Украінаю і Літвой.

Мой родны кут, як ты мне мілы!
Песня салаўя, подых ручая, рэха у гаях.
Забыць цябе не маю сілы,
Беларусь мая, Беларусь мая, Беларусь мая.

Кукавала зязюля. Пах у лесе чабор.
Выйшла пінская шляхта на прастор,
на шырокі прастор.
Хто смяецца апошні — пан сахі і касы.
Сабралася бедна басота залатыя ткаць паясы.

Ці смачна, дзядзечка, прызнайся,
Чуць віры свае, чуць віры свае,
чуць віры свае?
Паскудства, брат, і не пытайся,
Дзе басота п’е, дзе басота п’е,
дзе басота п’е.

Толькі ў сэрцы пачую
За краіну я жах,
Ўспомню Вострую Браму святую

І ваякаў на грозных канях.
Чорны замак Альшанскі
Сустракае гасцей.
Каб любіць Беларусь сваю,
Трэба дома бываць часцей.

Паэт сказаў: «П’ем за Айчыну,
За пахучы бэз, за дрымучы лес, за Усходні Крэс.»
О Беларусь, мая шыпшына!
Such a lovely place, such a lovely place,
such a lovely place.

Напрыканцы можна абмеркаваць наступныя пытанні:

1) А. Хадановіч склаў свой гумарыстычны верш з цытат. Ці аднолькавы сэнс нясуць адны і тыя ж цытаты ў песні і арыгінальным мастацкім творы?

2) Ці можаце прывесці прыклад, калі цытаты, вырваныя з кантэксту, выкарыстоўваліся у іншых мэтах.

Спасылка:
https://ipleer.com/song/89631115/Andrej_Hadanov_ch_-_Gatel_Belarus/

***Парада:***

Гэта практыкаванне можна выкарыстаць у інтэлектуальна-пазнавальных гульнях па беларускай літаратуры, яно скіравана на высокаматываваных вучняў, якія добра арыентуюцца ў творах мастацкай літаратуры і іх аўтарах.

***Аўтар:*** Юлія Некраш

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17246

# ЗАМЕЖНАЯ МОВА

## ЧЫЙ ГЭТА ПАКОЙ?

*Медыякампетэнцыі:* Інфармацыйная бяспека і ахова персанальных дадзеных. Правіла паводзінаў у сацыяльныя медыя. Веды пра аўтарскія правы і плагіят

Клас 6
*Прадмет:* Замежная мова
*Тэма ўрока:* «Мая кватэра/Мой дом»

*Мэта занятка:*
Навучанне правілам паводзін у інтэрнэт-прасторы і сацыяльных сетках. Даць вучням разуменне неабходнасці аховы персанальных дадзеных.

*Ход заняткаў:*
Загаддзя настаўнік просіць вучняў зрабіць фотаздымак свайго пакоя і даслаць асабіста настаўніку. Абавязкова тлумачыць некаторыя важныя правілы карыстання асабістымі фотаздымкамі і недапушчэнні іх распаўсюджвання ў сацыяльных сетках. Дамаўляецца з вучнямі, што будзе іх выкарыстоўваць толькі ў класе для вырашэння адукацыйных мэт.

За 2–3 дні да запланаванага ўрока вучні дасылаюць неабходныя фотаздымкі. Настаўнік аб'ядноўвае іх у адну прэзентацыю, ці проста выводзіць на дэманстрацыйны экран.

Вучні здагадваюцца, каму належыць пакой і абгрунтоўваюць адказ.

*Парады (для англійскай мовы):*
Вучні апісваюць пакой пры дапамозе фразы There is (are)...; ўжываюць не менш за 5 сказаў, у якіх будуць дадзеныя члены сказа, не менш за 3 азначэнні да кожнага дапаўнення; называюць гаспадара пакоя і аргументуюць сваё меркаванне пры дапамозе тлумачэння (because he/she likes..., his/her hobby is...; I know that...)

Пры наяўнасці часу можна зрабіць экспрэс-апытанне (тэхніка светлафор), ці змясцілі б вы свой фотаздымак у інтэрнэт і чаму. Настаўнік

запісвае на дошцы меркаванні, напрыклад: фота не нясе ніякай карыснай для іншых інфармацыі, змяшчае дэталі прыватнага жыцця, на ім бачны іншыя асобы, якія не давалі згоду на публікацыю і г. д. Хваліць вучняў за тое, што выпрацавалі свае правілы інтэрнэт-гігіены.

*Аўтар:* Наталля Катчанка

Спасылка на практыкаванне на сайце:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17212

## ЗНЕШНАСЦЬ ЧАЛАВЕКА І ХАРАКТАР

*Медыякампетэнцыі:* Уменне адрозніваць факты і меркаванні. Дэкадаванне медыятэкстаў. Распазнаванне стэрэатыпаў

Клас 7–9
*Прадмет:* Замежная мова
*Тэма ўрока:* Апісанне знешнасці і характара чалавека

*Мэта занятка:*
Развіваць уменне аналізаваць фотаздымкі, удасканальваць маўленне вучняў, іх творчыя здольнасці.

*Ход заняткаў:*
Працуючы ў парах, групах ці індывідуальна, вучні разглядаюць прапанаваныя фотаздымкі, апісваюць эмоцыі людзей на іх, тлумачаць, чаму яны лічаць, што чалавек радуецца/сумуе і да т. п. Пры рабоце ў пары адзін вучань можа апісваць толькі факты са знешнасці («светлыя валасы, блакітныя вочы»), а другі выказваць меркаванні («Мне падаецца, што чалавек на фота прыгожы, добры і да т.п.»).

Спасылка:
https://ru.depositphotos.com/stock-photos/%D1%8D%D0%BC%D0%BE%D1%86%D0%B8%D0%BE%D0%BD%D0%B0%D0%BB%D1%8C%D0%BD%D1%8B%D0%B5-%D0%BB%D1%8E%D0%B4%D0%B8.html

*Парады:*
Настаўніку варта падабраць вельмі разнастайныя фотаздымкі, тады пры рабоце з імі вучням прыдзецца ўзгадваць і замацоўваць

большую колькасць лексікі. Таксама настаўнік дае прыклад пастановачнага і рэпартажнага фота. Якім эмоцыям можна больш верыць?




Добры прыклад: прааналізаваць эмоцыі дзяўчынкі на гэтым фота. Потым распавесці яго гісторыю.

(*Гэта фота «з месца падзей», якое шырока разышлося ў прэсе і сацыяльных сетках у 2014 годзе і выклікала шырокі грамадскі рэзананс. Фота на самай справе не мае ніякага дачынення да украінскіх падзей. Дзяўчынка на фота — актрыса. На фота — працоўны момант на здымачнай пляцоўцы фільма «Брэсцкая крэпасць».)*

***Аўтар:*** Наталля Катчанка

Спасылка на практыкаванне на сайце:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17219

# ЗНЕШНАСЦЬ.
# ПРАЦА З ФОТАЗДЫМКАМ І ВІДЭАРОЛІКАМ

***Медыякампетэнцыі:*** Уменне адрозніваць факты і меркаванні. Распазнаванне стэрэатыпаў. Усведамленне ўплыву медыя на асобу і грамадства

Клас 7
***Прадмет:*** Замежная мова
***Тэма ўрока:*** Знешнасць

***Мэта занятка:***
Адысці ад стэрэатыпнага мыслення.

***Ход заняткаў:***
На пачатку занятку настаўнік паказвае вучням першую палову фотаздымка і пытаецца: «Што, па вашым меркаванні, хаваюць гэтыя людзі за спіной?»



Потым адкрывае другую частку. Пытаецца ў вучняў, чаму яны памыліліся. Пасля гэтага запісвае на дошцы ключавое пытанне:

Appearance = character? Why? Why not?

Вучням дэманструецца відэаролік з паўзамі.

На паўзах задаюцца наступныя пытанні:

What do you see? How many people? Describe their appearance.

What are they doing?(0–0.19)

How is the woman looking at the man in black clothes? Why do you think so? What is he carrying? (0.33)

Why did the police car stop? What are the policemen doing? (0.44–0.46)

Are they going to arrest the man with a beard? (0.57)

Were they going to arrest him? (1.04)

Why does the man with a briefcase looks scared? Why did he begin to run away? (1.08)

What did a policeman take out of the man's pocket? (1.26)

What did a policeman take out of the man's briefcase? (1.35)

What is the man with a beard doing? Who is next to him? (2.02–2.10)

Why have you mistaken?

Спасылкі:
http://pikabu.ru/story/vneshnostobmanchiva_414795
https://www.youtube.com/watch?v=CLMGtbc_bOU

***Парада:*** Фота можна раздрукаваць і раздаць вучням.

***Аўтар:*** Наталля Катчанка

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17210

## ДЭКАДАВАННЕ РЭКЛАМЫ. ТЭМА «У КРАМЕ»

***Медыякампетэнцыі:*** Дэкадаванне медыятэкстаў. Распазнаванне маніпуляцый. Распазнаванне рэкламы і прапаганды. Усведамленне ўплыву медыя на асобу і грамадства

Клас 7
***Прадмет:*** Замежная мова

*Тэма ўрока:* «У краме»

*Мэта занятка:*

Дэкадаванне маніпулятыўных прыёмаў, якія часцей за ўсё выкарыстоўваюцца стваральнікамі рэкламы.

*Ход заняткаў:*

Крытэрыі ацэнкі (НаШтоБуЗу):

— вучні даведаюцца аб сямі маніпулятыўных прыёмах, якія часцей за ўсё сустракаюцца ў рэкламе;

— на прыкладзе адной рэкламы яны змогуць знайсці не менш за 4 маніпулятыўныя прыёмы ў ёй;

— у якасці дамашняга задання вучні навучацца тлумачыць прысутнасць маніпулятыўных прыёмаў у самастойна адабранай імі рэкламе.

Настаўнік дэманструе вучням кароткі відэаролік з рэкламай сока.

Задае пытанне:

- Would you like to buy this juice? Why?
- Is the ad attractive? Why?
- What is the aim of the ad?
- Do you know that there are special tricks to make people buy things even if they don't need them?

Настаўнік тлумачыць вучням асноўныя маніпулятыўныя прыёмы, якія выкарыстоўваюцца стваральнікамі рэкламы:

- positive adjectives and superlative forms of comparison;
- «join us and you'll be cool»;
- not the whole truth about the product;
- negative comparison with «other products»;
- expert's opinion;
- repeated words or phrases, rhythm and rhyme;
- pleasant music and bright images

Пасля праслуханай інфармацыі настаўнік просіць вучняў «уключыць» крытычнае мысленне (switch on critical thinking) і яшчэ раз праглядзець тую ж самую рэкламу. Як толькі яны ўбачаць адзін з прыёмаў, яны павінны два разы хлопнуць у далоні. Настаўнік спыняе відэа, і вучні называюць выкарыстаны прыём.

У якасці дамашняга задання вучні павінны знайсці рэкламны ролік на англійскай мове працягласцю не больш за 1 хвіліну і на наступным уроку прадэманстраваць яго класу з тлумачэннем маніпулятыўных прыёмаў.

Спасылка:
https://www.youtube.com/watch?v=zY_OaZAIaFA

*Парада:* Папярэдзіць вучняў, што пры пошуку ў інтэрнэце мае значэнне мова запыту

*Аўтар:* Наталля Катчанка

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17216

## PICTURE DICTATION

*Медыякампетэнцыі:* Уменне адрозніваць факты і меркаванні. Веданне відаў і мовы медыя. Распазнаванне і аналіз стэрэатыпаў. Стварэнне, апрацоўка, прэзентацыя медыяпаведамлення

Клас 7–11
*Прадмет:* Замежная мова
*Тэма ўрока:* Практыкаванне можа быць выкарыстана пры вывучэнні любой тэмы пры наяўнасці тэматычных фотаздымкаў

*Мэта занятка:*
Паказаць вучням розніцу паміж рознымі відамі медыя.

*Ход заняткаў:*
Вучні дзеляцца на групы па 3 чалавекі. Пры гэтым у кожнага свая роля: Казачнік (Describer), Мастак (Artist) і Журналіст (Journalist)
Настаўнік прапануе групам фотаздымак з сюжэтам (варыянты могуць быць розныя):
- усе групы апісваюць адзін здымак;
- настаўнік прапануе вучням розныя здымкі (на іх выбар).

Казачнік (Describer) апісвае фотаздымак, Мастак (Artist) малюе так, як сабе прадстаўляе, Журналіст (Journalist) запісвае тэкст.
Пасля гэтага ў групе параўноўваюць фотаздымак, малюнак і тэкст. Робяць выснову пра інтэрпрэтацыю інфармацыі. Чаму яна ўзнікла.
Прыкладныя пытанні:
- Who or what attracts the main attention in the picture, in the drawing and in the text?

- What colours are used in the picture and in the drawing? What adjectives of colours are used in the description? Is there any difference?
- Did the Artist manage to reveal the plot of the picture?
- Did the Journalist manage to describe the whole plot?
- If there is any difference could you explain it?

Спасылка:
https://www.stb.ua/ru/2015/11/17/273225/

*Парада:*
Падбіраць фатаздымкі варта з улікам узроўню падрыхтоўкі вучняў.

*Аўтар:* Наталля Катчанка

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17205

## ЯКОЙ ПАВІННА БЫЦЬ ЯКАСНАЯ РЭКЛАМА?

*Медыякампетэнцыі:* Дэкадаванне медыятэкстаў. Распазнаванне рэкламы і прапаганды. Стварэнне, апрацоўка, прэзентацыя медыяпаведамлення. Сацыяльныя медыя

Клас 10
*Прадмет:* Замежная мова
*Тэма ўрока:* LA PRESSE. LA PUBLICITÉ

*Мэта занятка:*
Практыкаванне дапаможа вучням вызначыць крытэрыі якаснай рэкламы. Вучні змогуць расказаць пра рэкламу, зрабіць аналіз рэкламнага роліка і выказаць уласныя меркаванні аб яго якасці, а таксама створаць уласны рэкламны прадукт.

*Ход заняткаў:*
а) Перадтэкставы этап. Перад праглядам відэа настаўнік паказвае 5–6 слайдаў з рэкламай, дае кароткі каментарый, выказваючы ўласны пункт гледжання і задае пытанні аб адносінах да рэкламы, а таксама аб яе граматычных асаблівасцях (зняцце моўных цяжкасцей).

J’aime la publicité parce qu’elle me donne la possibilité de préparer tranquillement le repas pour ma famille. Je vais à la cuisine pour contrôler les casseroles sans perdre le sujet du film ou de l’émission que j’ai regardés.

Et vous, aimez-vous la pub? La regardez-vous souvent?

Quelle grammairel est le plus souvent utilisée dans la pub?

Вучні выказваюцца пра рэкламу і адзначаюць, што найчасцей у рэкламе прысутнічаюць шматлікія прыметнікі, а таксама дзеясловы ў загадным ладзе.

— Êtes-vous toujours un acheteur exigeant ou non? Est-ce que vous faites attention aux produits avant de les acheter? Peut-être vous vous laissez influencer par les appels publicitaires?

б) Тэкставы этап. Вучням прапаноўваецца паглядзець відэа і выступіць у якасці ўдзельніка фокус-групы па вывучэнню якасці рэкламнага роліка, адказаўшы на пытанні анкеты (першы прагляд відэа, пасля якога праводзіцца ўзаемакантроль у парах).

— Savez-vous qu’ avant d’apparaître sur l’écran ou dans les journaux chaque publicité est testée par un groupe special, nommé «focus-groupe» ou «groupe de discussion». Regardez un sujet-vidéo et compléter les cartes en répondant aux questions suivantes: Дадатак 1 (1 частка).

Пасля другога прагляду відэароліка вучням прапаноўваецца адказаць на пытанні, кантроль разумення праводзіцца франтальна. На аснове пытанняў вучні выказваюць уласныя меркаванні і робяць вывад аб якасці дадзенай рэкламы.

Regardez le sujet encore une fois et répondez aux questions: Дадатак 1 (2 частка).

Вучні робяць аналіз прадстаўленай рэкламы, вызначыюць яе тып, мэтавую аўдыторыю, слоган, а таксама задачы, што ставілі перад сабой стваральнікі гэтага роліка. Потым вучні выказваюць уласныя меркаванні адносна прадстаўленнага прадукту і спосабаў прыцягнення патэнцыяльных спажыўцоў. З дапамогай мазгавога штурму вучні вызначаюць крытэрыі якаснай рэкламы. (Трэба адзначыць, что акрамя таго вучні падводзяцца да высновы, што прадстаўленая ў ролiку інфармацыя можа быць ім карыснай, так як рэклама мае інфармацыйную функцыю: гэта рэклама адукацыйнай аплікацыі для мабільных тэлефонаў па вывучэнні французскай мовы).

в) Паслятэкставы этап. Работа ў групе. З улікам распрацаваных крытэрыяў якаснай рэкламы вучні ствараюць, а затым прадстаўляюць уласную рэкламу, звязаную са школай. Потым адбываецца абмеркаванне.

Спасылка:
https://www.dailymotion.com/video/xiax48

*Парада:*
Дадаткі можна спампаваць па ссылцы на практыкаванне.

*Аўтар:* Ала Лобач

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17437

# ІНФАРМАТЫКА

## ОСНОВНЫЕ СЕРВИСЫ ИНТЕРНЕТА, ИХ НАЗНАЧЕНИЕ

*Медыякампетэнцыі:* Пошук інфармацыіі

Клас 6
*Прадмет:* Інфарматыка
*Тэма ўрока:* Понятие сети Интернет

*Мэта занятка:*
Расширить представление учеников о сети Интернет.

*Ход заняткаў:*
Класс делится на две группы, им даётся одна и та же таблица с основными понятиями темы, которую нужно заполнить.

| | |
|---|---|
| Интернет | |
| Компьютерная сеть | |
| Электронная почта | |
| Интернет-провайдер | |

| | |
|---|---|
| Назначение сети Интернет | |
| WWW (World Wide Web) | |
| «Бесполезная информация» | |
| Веб-сайт | |
| Веб-страница | |
| Адрес сайта | |
| Протокол передачи данных | |
| Гиперссылка | |
| Браузер | |
| Примеры браузеров | |

1 группа: используя материал учебного пособия «Информатика», 6 класс (п. 21) заполняет предложенную таблицу.

2 группа: посмотреть видеоролик «Интернет» и заполнить предложенную таблицу

После выполнения задания в группах следует организовать обсуждение полученных результатов, и сформулировать мысль о том, что информация из различных источников отличается (полнота, ясность, актуальность).

Обе группы после беседы, дополняют свои таблицы. И делают вывод, что пользоваться одним источником информации недостаточно. В различных источниках можно найти больше информации и проверить ее правдивость.

Спасылка:
https://www.youtube.com/watch?v=sWSkhvpaHog

***Парада:***

На следующем уроке эту таблицу можно использовать для проверки домашнего задания (задание с пропусками)

***Аўтар:*** Людміла Падаксёнава

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17306

# ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ, ШТО?

***Медыякампетэнцыі:*** Пошук інфармацыіі. Стварэнне, апрацоўка, прэзентацыя медыяпаведамлення

Клас 9, 10

***Прадмет:*** Інфарматыка

***Тэма ўрока:*** Паняццє інфармацыйнай мадэлі. Прызначэнне інфармацыйнай мадэлі

***Мэта занятка:***

Пазнаёміць вучняў з правіламі і тонкасцямі пошуку інфармацыі ў Інтэрнэце.

***Ход заняткаў:***

Прапанаваць вучням словазлучэнне «Зямны яблык». Выслухаць здагадкі пра сувязь дадзенага словазлучэння з тэмай урока.

Заданне 1. «Шукай і знойдзеш!». Прапанаваць вучням знайсці адказы на пытанні, выкарыстоўваючы Пошук інфармацыіі ў сетцы Інтэрнэт.

- Назавіце год, месца і імя вучонага, які стварыў «Зямны яблык».
- Ці можна сцвярджаць, што «Зямны яблык» — першая мадэль Зямлі?
- Апішыце, як выглядае «Зямны яблык».
- У якім годзе «Зямны яблык» быў прадстаўлены на ўсеагульны агляд?
- Хто стварыў першую мадэль нашай планеты?
- Арганізаваць абмеркаванне вынікаў працы.

Заданне 2. «Давярай, але правярай». Прапанаваць вучням адказаць на пытанні: Якую форму мае наша планета? Адкуль вы гэта ведаеце? Ці правяралі вы калі-небудзь дакладнасць гэтай інфармацыі? Выкарыстоўваючы інфармацыю з сеткі Інтэрнэт, знайдзіце адказ на пытанне «Якую форму мае планета Зямля?» і параўнаце свае веды з навуковымі фактамі.

Заданне 3. «Ствараем мадэль». Прапанаваць навучэнцам стварыць інфармацыйную мадэль Зямлі, выкарыстоўваючы графічны або тэкставы рэдактар. Нагадаць пра неабходнасць пазначыць спасылкі на крыніцы інфармацыі.

Арганізаваць прадстаўленне вынікаў працы.

Спасылка:
http://nastroenie.tv/episode/132234

*Парада:*
Абмежаваць час пошуку адказаў на другое пытанне.

*Аўтар:* Вольга Счасновіч

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17233

## СОЗДАЕМ БАЗУ ДАННЫХ «РЕКЛАМА В НАШЕЙ ЖИЗНИ»

*Медыякампетэнцыі:* Пошук інфармацыіі. Распазнаванне рэкламы і прапаганды. Веды пра этыку і журналісцкія стандарты. Адказнае карыстанне сацыяльнымі медыя

Клас 11
*Прадмет:* Інфарматыка
*Тэма ўрока:* Создание базы данных

*Мэта занятка:*
Анализ рекламных роликов.

*Ход заняткаў:*
1. Определение что такое реклама и для чего она нужна, видов манипуляций.
2. Разбор рекламы про сок — фронтально, заполнение базы данных.
3. Предложить учащимся найти рекламу в Интернете по одной из интересующих тем (красивые волосы, любимый сок, чистота, другое).
4. Создать базу данных с полями: продукт рекламы, бренд, применение, способ привлечения внимания или вид манипуляции, нацелена на какую аудиторию, время рекламы и т. д. Наполнить ее информацией согласно найденным рекламным медиапродуктам.
5. После выполнения упражнения организовать обсуждение. Это упражнение поможет учащимся критически оценивать содержание

рекламы: интерпретировать содержание, опираясь на ранее приобретенные знания; видеть манипуляции.

Спасылка:
https://nektosteen.livejournal.com/197431.html

***Парады:*** Четкий инструктаж перед выполнением задания, четкая работа со временем.

***Аўтар:*** Вольга Кецко

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17307

# ГІСТОРЫЯ

## ПОМНІК ЯК НАВІНА

***Медыякампетэнцыі:*** Навінная пісьменнасць. Усведамленне ўплыву медыя на асобу і грамадства

Клас 8
***Прадмет:*** Гісторыя Беларусі
***Тэма ўрока:*** Любая, звязаная з пэўнай гістарычнай асобай

***Мэта занятка:***
Удзельнікі папрацуюць з помнікам як з актуальнай навіной: прааналізуюць фота помніка па ключавых пытаннях для аналізу, параўнаюць загалоўкі публікацый аб адкрыцці помніка ў розных выданнях і растлумачаць іх асноўныя ідэі, пасылы.

***Ход заняткаў:***
Этапы практыкавання:
1. Мазгавы штурм: настаўнік паказвае фота новага помніка, напрыклад, Тадэўша Касцюшкі і прапануе вучням даць яму сваю назву,

асабліва цікава, калі ўдзельнікі бачаць яго ўпершыню і нічога пра яго не ведаюць. Усе ідэі запісваюцца на дошцы.

2. Праца ў парах. Абмен меркаваннямі па наступных пытаннях.

- Каму гэты помнік? (Пра што нам распавядаюць дэталі, сімвалы, адзенне?)
- Якую гісторыю распавядае помнік?
- Хто і пра што павінен успамінаць на гэтым месцы?
- Якія каштоўнасці транслюе помнік? Адпавядае гэта вашым каштоўнасцям і ўстаноўкам?
- Якую функцыю мае помнік у грамадскай прасторы?
- Дазволілі б вы ўсталяваць гэты помнік, каб былі старшынёй гавыканкама? Чаму?

3. Кароткая інфармацыя настаўніка пра помнік: настаўнік паведамляе назву помніка, дзе і калі ён устаноўлены і хто з'яўляецца ініцыятарам мемарыялізацыі.

4. Групавая работа з загалоўкамі публікацый аб адкрыцці гэтага помніка

Кожная група атрымлівае аднолькавыя наборы выразак загалоўкаў і назваў выданняў, у якіх матэрыялы былі апублікаваныя. Лепш не браць многа выданняў (максімум 4–5). Удзельнікі суадносяць загаловак і выданне, дзе матэрыялы апублікаваныя, тлумачаць чаму яны так лічаць. Вынікі працы групы афармляюцца на асобным лісце як калаж.

5. Абмеркаванне вынікаў групавой работы

Удзельнікі параўноўваюць калажы, вылучаюць супадзенні і адрозненні, выслухоўваюць каментары адзін аднаго. Настаўнік раздае групам пакеты скрыншотаў публікацый з загалоўкамі (ці паказвае іх на экране) і праводзіць выніковае абмеркаванне прычын адрознення асноўных мэсыджаў аб усталяванні помніка, якія залежаць ад уласніка выдання і яго мэтавай аўдыторыі, жанру публікацыі).

Спасылкі:
http://www.nastaunik.info/node/16259
https://www.racyja.com/hramadstva/u-slonime-urachysta-adkryli-pomnik-lv/

***Парада:***

Пажадана знайсці не менш за тры крыніцы, дзе была апублікавана інфармацыя пра адкрыццё помніка.

***Аўтар:*** Алена Палейка

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17208

## ВІКІПЕДЫЯ ЯК КРЫНІЦА ІНФАРМАЦЫІ

*Медыякампетэнцыі:* Пошук інфармацыіі. Вызначэнне надзейнасці крыніц інфармацыі

Клас 8–11
*Прадмет:* Гісторыя
*Тэма ўрока:* Любая, звязаная з гістарычнай асобай ці падзеямі

*Мэта занятка:*

Паказаць вучням наяўнасць адрозненняў у крыніцах інфармацыі на розных мовах.

*Ход заняткаў:*

Настаўнік прапануе знайсці ў Вікіпедыі артыкулы, прысвечаныя біяграфіі вядомай персоны (гістарычнага дзеяча, пісьменніка, навукоўца і інш.) на розных мовах (беларускай, англійскай, рускай, польскай, украінскай і інш.), прачытаць іх, перакласці, абмеркаваць у групах наступныя пытанні:

- Ці істотна адрозніваецца змест артыкула пра дзеяча на розных мовах? Чаму?
- На якія крыніцы спасылаюцца старонкі Вікіпедыі на розных мовах? Ці шмат сярод іх першакрыніц?
- Ці можна выкарыстоўваць Вікіпедыю ў якасці крыніцы інфармацыі? Чаму?
- Плюсам ці мінусам з'яўляецца захаванне Вікіпедыяй інфармацыі пра ўсіх аўтараў, якія ўносілі карэкціроўкі ў артыкул (гл. гісторыю правак артыкула)?
- Ці будуць істотна адрозніваццца артыкулы пра дзеяча ў розных варыянтах беларускага правапісу (афіцыйным і класічным)?

Плануецца, што напрыканцы дыскусіі ўдзельнікі прыйдуць да наступных высноваў:

- для эфектыўнай работы з матэрыяламі свабоднай энцыклапедыі трэба ведаць асноўныя правілы Вікіпедыі, асаблівасці яе структуры і функцыянавання

- рэкамедуецца выкарыстоўваць Вікіпедыю для азнаямлення з матэрыяламі па пэўнай тэме, але ўстрымлівацца ад ўспрымання яе ў ролі эксперта і не спасылацца на Вікіпедыю як на крыніцу
- пасля таго, як азнаёміліся з інфармацыяй у Вікіпедыі, неабходна пашукаць больш падрабязныя звесткі, а для пошуку выкарыстоўваць ключавыя словы і крыніцы з вікіартыкула.

Спасылкі:
https://budzma.by/news/wiki-kalinouski.html?fbclid=IwAR25t7LE3H9dOajBHa5TEq5Sy4xO7uspOgflagOtB-rkZtuPPjOPVM25jQ8

***Парады:***

Як варыянт, можна знайсці ў Вікіпедыі артыкулы, прысвечаныя гістарычным падзеям. Практыкаванне можна правесці з любой аўдыторыяй, пачынаючы з вучняў 8 класа. Па спасылцы можна знайсці матэрыялы для правядзення гэтага практыкавання па тэме «Паўстанне 1863–1864 гг. у Беларусі, Літве і Польшчы» (Гісторыя Беларусі, 8 клас, К. Каліноўскі)

***Аўтар:*** Алена Палейка

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17198

## КАРЫКАТУРЫ І ПЛАКАТЫ ЧАСОЎ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***Медыякампетэнцыі:*** Пошук інфармацыіі. Уменне адрозніваць факты і меркаванні. Дэкадаванне медыятэкстаў. Распазнаванне маніпуляцый, стэрэатыпаў, мовы варожасці

Клас 9
***Прадмет:*** Гісторыя
***Тэма ўрока:*** Пачатак Першай сусветнай вайны. Ваенныя дзеянні 1914–1916 гг.

***Мэта занятка:***

Вучні змогуць крытычна ацаніць, параўнаць, зрабіць высновы, прааналізаваць сімвалы, вызначыць галоўную ідэю, выказаць сваё

стаўленне да таго, што паказана на плакаце ці карыкатуры. Вучні павінны зразумець, што і плакат і карыкатура, як і любы іншы медыятэкст маюць пасыл, які трэба дэкадаваць.

*Ход заняткаў:*

1. Клас падзелены на дзве групы. Першая група атрымлівае лісты з плакатамі, другая з карыкатурамі. Разам з лістамі атрымліваюць памяткі як працаваць з карыкатурай і плакатам. Памятку можна ўзяць з артыкула «А. Палейка, Н. Ільініч. Рэкамендацыі па фарміраванні медыяграматнасці на ўроках гісторыі і грамадазнаўства».

Схема аналізу плаката.

1. Вызначыць падзею (яе дату), якой прысвечаны плакат.
2. Вызначыць, па чыім палітычным заказе ён быў выраблены і для якой аўдыторыі.
3. Прааналізаваць персанажаў і сімвалы плаката.
4. Звярнуць увагу, якія фігуры, аб'екты вынесены на першы план і аднесены на другі план.
5. Прааналізаваць, якія фігуры і аб'екты намаляваныя вялікімі, а якія маленькімі і чаму.
6. Сфармуляваць паведамленне, якое плакат быў прызваны данесці да аўдыторыі.

Схема аналізу карыкатуры.

1. Апішыце вобразы, персанажаў, задні план.
2. З дапамогай якіх мастацкіх сродкаў створаны вобразы і персанажы?

Інтэрпрэтацыя.

1. Паглядзіце на час стварэння карыкатуры. Якой падзеі яна прысвечана?
2. Ці пазналі вы персанажаў? Чаму вы так думаеце? Калі гэта рэальныя фігуры — назавіце іх і ролю, якую яны адыгрывалі на той час і ў тых падзеях, якія суправаджалі з'яўленне карыкатуры?
3. Вызначыце, якія сімвалы выкарыстаў мастак? Чаму ён да іх звярнуўся?
4. Якое стаўленне да персанажаў — станоўчае ці адмоўнае — выяўляе карыкатура?
5. Як інтэрпрэтуе карыкатура персанажаў? Ці згодныя вы з ёй?
6. Якія ідэі і палітычная пазіцыя аўтара? Як бы вы іх вызначылі?

7. Што вы ведаеце з іншых крыніц пра падзеі, якім прысвечана карыкатура? Як ваша веданне суадносіцца з тым, што вы даведаліся, дзякуючы карыкатуры?

8. Кожная група робіць паведамленне з адказамі на пытанні. Напрыканцы настаўнік прапануе выказаць сваё ўласнае стаўленне да галоўнай ідэі карыкатуры ці плаката.

Спасылкі:

- карыкатуры: https://homsk.com/trombon/karikatury-geograficheskikh-kart-pervoy-mirovoy
- плакаты: https://ria.ru/20141006/1027076432.html

***Парады:***

Лепш узяць для параўнання адну брытанскую, адну нямецкую і расійскую карыкатуры. Можна выкарыстаць брытанскі, амерыканскі і італьянскі плакаты аб прызыве ў войска. Напрыканцы практыкавання групам можна даць заданне стварыць свой слоган да плаката.

***Аўтар:*** Юлія Фядзяніна

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17254

## ПАЛІТЫЧНАЯ КАРЫКАТУРА ЧАСОЎ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***Медыякампетэнцыі:*** Уменне адрозніваць факты і меркаванні. Дэкадаванне медыятэкстаў. Распазнаванне стэрэатыпаў, мовы варожасці. Аналіз рэкламы і прапаганды

Клас 9

***Прадмет:*** Гісторыя

***Тэма ўрока:*** Первая мировая война. Основные события и ход военных действий в 1917–1918 гг.

***Мэта занятка:***

Показать, что политическая пропаганда в годы Первой мировой войны играла важную роль в формировании образа врага, в дискре-

дитации противоборствующей стороны, в использовании и создании определённых стереотипов.

*Ход заняткаў:*

Вступительное слово учителя:

— Как вы считаете, какие факторы были определяющими в борьбе с противником в годы Первой мировой войны? (военная сила, вооружение, мастерство полководцев, экономическая мощь, научные открытия и т. д.)

Как известно, все «войны начинаются не на полях сражений, а в головах людей» (Устав ЮНЕСКО). В условиях тотальной войны 1914–1918 гг. пропаганда, наряду с военной силой и экономическим давлением, стала третьим главным оружием борьбы с неприятелем. В эти годы карикатура пережила настоящий подъем во всех воюющих странах.

Заметно увеличились тиражи сатирических журналов, карикатуры ежедневно публиковались в газетах, выходили на отдельных листах и почтовых открытках, многие издания также выпускали иллюстрированные бесплатные листовки, предназначенные для солдат, с аэропланов и воздушных шаров эту продукцию разбрасывали по окопам противника.

Сегодня мы познакомимся с карикатурами, созданными в годы Первой мировой войны и попытаемся ответить на предложенные вопросы.

Ключевой вопрос, на который мы будем искать ответ:

— Какую роль, на ваш взгляд, играла политическая карикатура в годы Первой мировой войны? (ответы на ключевой вопрос учащиеся записывают маркерами на листах А4 и прикрепляют к доске).

**Работа в группах**

Каждая группа получает раздаточный материал (две группы — карикатуры созданные в странах Антанты, и две группы — карикатуры, созданные в странах Тройственного союза) + вопросы для обсуждения.

Вопросы для обсуждения в группах:

- Как вы считаете, в странах какого блока в период Первой мировой войны были созданы данные карикатуры?
- Кто изображён на карикатурах? Какие символы, стереотипы, приёмы используются для того, чтобы создать образ врага?

- Для чего врага изображают именно так? Какие чувства, мысли должна вызывать данная карикатура у тех, для кого она предназначена?

**Обсуждение итогов работы**

Каждая группа озвучивает результаты своей работы. При обсуждении карикатуры демонстрируются на мультимедиа, чтобы все понимали, о чем идет речь. Обсуждаются ответы на ключевой вопрос. (Ответы учащихся: карикатура использовалась для того, чтобы было легче убивать, чтобы поднять патриотический дух, чтобы дискредитировать врага, чтобы убедить в близкой победе, чтобы представить врага слабым, жалким, смешным и т. д.)

Чем современные приёмы пропаганды отличаются от тех, которые существовали раньше? Чем они похожи? Нужно ли этому противостоять? Каким образом мы можем это делать?

Спасылка:
https://docs.google.com/document/d/1LZuAQ2Dihvh5AAmQ_ZmVuiA0ieRDqGhqHED3IzCneyg/edit?usp=sharing

***Парада:***

В конце урока попросить учеников привести примеры современной пропаганды.

***Аўтар:*** Жана Цімчанка

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17252

## ПОСТЭР ЦІ ТРЭЙЛЕР ЯК ПАДАГУЛЬНЕННЕ ВЫВУЧАНАЙ ТЭМЫ

***Медыякампетэнцыі:*** Дэкадаванне медыятэкстаў. Распазнаванне жанраў медыя. Стварэнне, апрацоўка, прэзентацыя медыяпаведамлення

Клас 9–11
***Прадмет:*** Гісторыя

*Тэма ўрока:* Урок абагульнення ці «Наш край»

*Мэта занятка:*
Далучыць вучняў да самастойнага стварэння медыя.

*Ход занятkaў:*
Вучні па схеме перакуленага ўрока рыхтуюць дамашняе заданне — ствараюць постэр (ці трэйлер) мастацкага фільма, які па іх меркаванні найлепш адлюстроўвае гістарычную эпоху ці мастацкі твор (для ўрока літаратуры), які вывучаецца. У класе пасля прэзентацыі постэраў і трэйлераў адбываецца абмеркаванне, чаму вучні адабралі менавіта гэтыя фільмы.

Галоўныя характэрыстыкі постэра (трэйлера), які мусіць:
- даць разуменне жанру
- зацікавіць гледачоў, але не распавесці ўсю гісторыю цалкам
- трансляваць асноўную ідэю карціны
- пазнаёміць з галоўнымі акцёрамі
- прадэманстраваць аўтарскае выказванне

Абавязковая інфармацыя на постэры (трэйлеры):
- назва карціны (таксама можна выкарыстоўваць слоган, калі ён ёсць)
- імя рэжысёра і студыя-вытворца
- дата прэм'еры
- узроставыя абмежаванні (неабходны параметр ў айчынным пракаце)
- прызы і ўзнагароды

Патрабаванне да трэйлера — працягласць не больш за 1–1,5 хв.

Спасылкі:
https://www.youtube.com/watch?v=qqIYSNQ85DU&feature=youtu.be

*Парада:*
Мэтазгодна даваць дамашняе заданне па схеме перакуленага навучання. Прагляд створаных вучнямі трэйлераў і постэраў для мастацкіх фільмаў найлепш арганізаваць на ўроку абагульнення ці на ўроку «Наш край».

*Аўтар:* Алена Палейка

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17227

# ТРЭЙЛЕР ГІСТАРЫЧНАГА ФІЛЬМА ДЛЯ МЭТАВЫЗНАЧЭННЯ

*Медыякампетэнцыі:* Дэкадаванне медыятэкстаў. Мова медыя. Жанры медыя

Клас 9–11
*Прадмет:* Гісторыя
*Тэма ўрока:* Любая гістарычная падзея па тэме ўрока, пра якую зняты мастацкі фільм

*Мэта занятка:*
Плануецца, што ўдзельнікі вылучаць сродкі, якімі галоўная ідэя (message) фільма даносіцца да шырокай аўдыторыі.

*Ход заняткаў:*
Вучні працуюць з трэйлерам гістарычнага фільма па тэме, якая вывучаецца на ўроку. Перад дэманстрацыяй трэйлера і пасля яго прагляду абмяркоўваюцца наступныя пытанні.

Перад праглядам:
1) Што такое трэйлер?
2) З якой мэтай ён ствараецца і дэманструецца?
3) Ці станеце вы глядзець фільм, калі трэйлер вам не спадабаўся?

Пасля прагляду:
1) Якой гістарычнай падзеі прысвечаны трэйлер фільма?
2) Хто паказаны агрэсарам, а хто ахвярай?
3) Якія вобразы выкарыстоўвалі аўтары для таго, каб драматызаваць падзеі?
4) Да якіх пачуццяў, на ваш погляд, апелююць аўтары? Якія эмоцыі імкнуцца выклікаць?
Фармулёўка мэтаў урока з апорай на гістарычны складнік відэафрагмента:
1) Даведацца, следствам чаго сталі падзеі, якое знайшлі адлюстраванне ў трэйлеры фільма
2) Высветліць, чым скончылася падзея і якія былі яе далейшыя наступствы.

Кейсы:

Трэйлер фільма «Варшаўская бітва» (Польшча, 2011. Рэжысёр — Ежы Гофман). Трэйлер можна паказаць перад вывучэннем тэмы «Другое абвяшчэнне ССРБ і завяршэнне польска-савецкай вайны (Гісторыя Беларусі, 9 клас, 11 клас).

Трэйлер фільма «Купала» (Беларусь, 2019. Рэжысёр — Уладзімір Янкоўскі). Трэйлер можна паказаць пры вывучэнні тэмы «Жыццёвы шлях Янкі Купалы» (Беларуская літаратура, 9 клас).

Спасылкі:
https://youtu.be/jvtNMyC7tmo
https://youtu.be/LQIX95MJuRA

***Парада:***

Можна даць прагляд усяго фільма і параўнанне яго з фактамі з падручніка ў якасці дамашняга задання.

***Аўтар:*** Віктар Жук

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17200

# ГРАМАДАЗНАЎСТВА

## БУДУЧЫНЯ ЧАЛАВЕЦТВА

***Медыякампетэнцыі:*** Пошук інфармацыіі. Вызначэнне надзейнасці крыніц інфармацыі

Клас 11
***Прадмет:*** Грамадазнаўства
***Тэма ўрока:*** Глабальныя праблемы сучаснасці

***Мэта занятка:***

Крытычнае стаўленне да інфармацыі, атрыманай у СМІ.

*Ход заняткаў:*

Напачатку агучваецца спіс глабальных для чалавецтва пагроз. Далей выбіраецца адна з іх, якая будзе разглядацца і вывучацца (спасылкі дадзены на пагрозу вывяржэння вялікага вулкана і магчымыя наступствы). Вучні атрымліваюць заданне знайсці 4–5 сайтаў з паведамленнямі пра абраную пагрозу, аналізуюць крыніцы і медыятэксты з абраных сайтаў, робяць высновы, якім з іх можна давяраць, аналізуюць верагоднасць ажыццяўлення песімістычных сцэнараў і шляхоў прадухілення пагрозы. Вынікі працы прадстаўляюцца класу.

Спасылкі:
http://vulkania.ru/vulkanyi/vulkanyi-severnoy-i-tsentralnoy-ameriki/supervulkan-yelloustoun.html
http://esgeo.ru/

*Парады:*

Правесці ацэнку пагрозы чалавецтву на высновах, зробленых па матэрыялах адабраных медыякрыніц, прапанаваць спосабы выратавання чалавецтва. Прымяніць веды па біялогіі, геаграфіі, фізіцы, астраноміі для выканання задання. Тэма займае два ўрокі, і вучні маюць магчымасць пракансультавацца ў настаўнікаў іншых прадметаў.

*Аўтар:* Людміла Гурыновіч

Спасылка на практыкаванне на сайце:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/16841

## САЦЫЯЛЬНЫ ПАРТРЭТ БЕЛАРУСІ

*Медыякампетэнцыі:* Пошук інфармацыіі. Вызначэнне надзейнасці крыніц інфармацыі

Клас 11
*Прадмет:* Грамадазнаўства
*Тэма ўрока:* Сацыяльны партрэт Беларусі

*Мэта занятка:*

Асэнсаваць наяўнасць і масавасць прысутнасці фэйкавых навін у інтэрнэт-прасторы, неабходнасці крытычнага стаўлення да любой інфармацыі.

*Ход заняткаў:*

Кожная група атрымлівае заданне на аснове розных СМІ стварыць інтэрактыўны плакат па тэмах:

1) сацыяльная сфера жыцця беларускага грамадства;

2) эканамічная сфера жыцця беларускага грамадства.

За два тыдні да ўрока вучні дзеляцца (шляхам лёсавання) на 2–4 групы. Кожная група атрымлівае заданне стварыць інтэрактыўны плакат па тэмах:

1) сацыяльная сфера жыцця беларускага грамадства;

2) эканамічная сфера жыцця беларускага грамадства.

Умовы стварэння плаката:

1) выкарыстоўваць (візуалізаваць) інфармацыю з сеткі Інтэрнэт, друкаваных СМІ, тэлебачання па атрыманай тэме;

2) крыніцы, якімі карысталіся, важна захаваць для сябе, але не паказваць на плакаце;

3) абавязкова размясціць на плакаце 5 топ-навін рэальных і 2–3 фэйкавыя (але без пазнакі, якая з іх якая).

На ўрок навучэнцы прыносяць гатовыя плакаты. Групам прапануецца абмяняцца плакатамі (парадак абмену можа быць любы).

1 этап (15 хвілін): кожная група, карыстаючыся інтэрнэтам, павінна знайсці прапанаваныя ў плакатах навіны, вызначыць, якія з іх рэальныя, а якія фэйкавыя, растлумачыць свае адказы. (На працягу 7 хв. шукаем, потым 8 хв. тлумачым.)

2 этап (15 хвілін): клас дзеліцца на дзве групы (любым зручным і хуткім спосабам). Першая група на аснове атрыманых вынікаў працы стварае інтэрактыўны плакат рэальных навін Беларусі, другая — плакат фэйкавых навін. Створаныя плакаты вывешваюцца на дошку і параўноўваюцца.

Такім чынам, можна зрабіць выснову: як выглядае Беларусь рэальна і якой яе можна ўбачыць, калі некрытычна падыходзіць да інфармацыі, якую мы атрымліваем з розных крыніц.

Спасылкі:

https://ont.by/news/koronavirus-v-belarusi-minzdrav-rasskazal-ob-obstanovke-v-strane-na-23-marta

https://www.svaboda.org/a/30502645.html?fbclid=IwAR137fqJRoOvTyO6wGwZtrqVgKeOpLX0jckTyxWV0761jJFbK5IDMrQr41g

*Парада:*

У скарочанай форме практыкаванне можна правесці падчас інфармацыйнай гадзіны.

*Аўтар:* Ларыса Валынец

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/16907

# ГЕАГРАФІЯ

## БЕЗ МЕРЫ НЯМА ВЕРЫ, АБО ЯК НАМІ МАНІПУЛЮЮЦЬ ГЕАГРАФІЧНЫЯ МАПЫ

*Медыякампетэнцыі:* Пошук інфармацыіі. Вызначэнне надзейнасці крыніц інфармацыі

Клас 7
*Прадмет:* Геаграфія
*Тэма ўрока:* Палітычная мапа свету

*Мэта занятка:*

Растлумачыць ўдзельнікам, што розныя віды геаграфічных мапаў могуць фармаваць скажонае ўспрыманне свету; паказаць, як гэтыя стэрэатыпы ўплываюць на палітыку, эканоміку і людзей; навучыць іх крытычна ўспрымаць візуальную інфармацыю і пераправяраць яе ў розных крыніцах.

*Ход заняткаў:*

Настаўнік паказвае вучням мапу свету і тлумачыць, што большасць людзей з дзяцінства прызвычаілася да выгляду мапаў у кабінетах геаграфіі, атласах, у Інтэрнэце. Там свет выглядае прыкладна аднолькава (гл. Першы малюнак у раздзеле «Дапаможныя матэрыялы»).

## ПОЛИТИЧЕСКАЯ КАРТА МИРА




Настаўнік просіць вызначыць на вока, у колькі разоў Расія большая за Бразілію. (Варыянт для менш падрыхтаванай аўдыторыі: параўнаць плошчу афрыканскага кантынента і Расіі — альбо Афрыкі і Паўночнай Амерыкі). Здагадкі ўдзельнікаў запісваюцца на дошцы.

Настаўнік аб’ядноўвае ўдзельнікаў у групы па 4–5 чалавек і прапануе з дапамогай смартфонаў знайсці плошчы гэтых краін (і / або кантынентаў) у адкрытых інтэрнэт-крыніцах і параўнаць іх. Вынікі запісваюцца на дошцы побач з выказанымі раней гіпотэзамі (Бразілія — 8,5 млн км$^2$, Расія — 17,1 млн км$^2$; афрыканскі кантынент — 29,2 млн км$^2$).

Настаўнік задае пытанні: «Чаму нас падманваюць геаграфічныя мапы? Чаму плошчы краін не прапарцыйныя адпаведным малюнкам на мапе?». Вучні рыхтуюць адказы ў групах і прэзентуюць іх. Настаўнік падводзіць вынікі і тлумачыць наступнае: «Вядома, што Зямля мае форму шара, і яе паверхню на плоскім лісце паперы можна намаляваць толькі са скажэннямі. Існуюць некалькі падыходаў у картаграфіі, якімі можна праецыраваць сферу на плоскі экран: усе яны маюць свае перавагі і недахопы. Мапы Google і «Яндэкс» дастаткова блізкія

да роўнавугольнай цыліндрычнай праекцыі Меркатара. Уявіце сабе цыліндр, надзеты на зямны шар, да якога планета дакранаецца па экватары. Пры гэтым на ім па крупінках малююцца аб'екты Зямлі. Гэтая праекцыя набліжана да рэальнасці — тым не менш, на ёй ёсць скажэнне плошчаў аб'ектаў: чым далей размешчаны аб'ект ад экватара, тым больш вялікім ён здаецца. Гэта найбольш бачна на прыкладзе Грэнландыі з-за яе паўночнага размяшчэння. У рэчаіснасці ў параўнанні з Афрыкай Грэнландыя выглядае нашмат меншай (гл. мал. 2 у раздзеле «Дапаможныя матэрыялы»).

Пасля гэтага настаўнік прапануе разгледзець іншую мапу свету ў праекцыі Гала-Петэрса. У яе аснову пакладзены прынцып роўнавялікасьці (маштаб плошчаў застаецца нязменным) — г. зн. яна рэальна адлюстроўвае плошчы, хоць таксама мае скажэнні (гл. мал. 3 у раздзеле «Дапаможныя матэрыялы»).

Настаўнік знаёміць вучняў з паняццямі «стэрэатып» і «медыя».

Стэрэатып — гэта ўстойлівы шаблон мыслення, забабон, які часта мае мала агульнага з рэальнасцю, і можа быць прычынай прадузятасцяў.

Медыя — гэта шырокае паняцце, якое ўключае ў сябе сукупнасць інфармацыйных сродкаў і прыёмаў, якія служаць для перадачы паведамлення канкрэтнаму спажыўцу (друкаванае слова, музычная кампазіцыя, радыёперадача і т. п.) у той ці іншай форме.

Настаўнік тлумачыць, што геаграфічная мапа перадае інфармацыю з дапамогай малюнка — г. зн. нясе пэўны медыяпасыл.

Настаўнік задае пытанне аўдыторыі: «Ці можа такі аб'ект, як геаграфічная мапа, ствараць пэўныя стэрэатыпы? З чым яны звязаны?» (З памерам краін, іх геаграфічным становішчам). Ён просіць прывесці прыклады такіх стэрэатыпаў.

У пацверджанне высноваў удзельнікаў дэманструецца, як бы выглядаў на мапе «маленькі» В'етнам, перанесены на еўрапейскую шырату (гл. мал. 4 у раздзеле «Дапаможныя матэрыялы»). Тлумачыцца, што такія скажэнні на мапе ствараюцца не спецыяльна, так як намаляваць мапу свету без скажэнняў можна толькі на сферычнай паверхні (глобусе).

Работа ў групах для аналізу геаграфічных мапаў: настаўнік раздае групам мапы свету, створаныя ў розных краінах з рознымі мэтамі, і заданні (мапы для аналізу: Аўстралія, Кітай, ПАР, мапа свабоды прэсы, створаная арганізацыяй «Рэпарцёры без межаў»).

Групы адказваюць на наступныя пытанні:

- Хто стварыў гэтую мапу?
- У чыіх інтарэсах інфармацыя прадстаўлена менавіта такім чынам?
- Для каго яна створана?
- Што намалявана ў цэнтры?
- Што вынесена на перыферыю?
- Як падабраныя колеры?
- Чаго не хапае? Чаму?
- Якія ідэі, пункты гледжання, каштоўнасці даносяцца да гледача?
- Якія сродкі для гэтага выкарыстоўвалі стваральнікі мапы? (Размяшчэнне, выбар картаграфічнай праекцыі, расфарбоўка ...)
- Як розныя людзі могуць інтэрпрэтаваць гэты малюнак?
- Як я інтэрпрэтую гэтую выяву?
- Якія стэрэатыпы гэтая мапа можа ўмацаваць, якія разбурыць?
- Удзельнікі прэзентуюць вынікі работы ў групах.

Абмеркаванне вынікаў: абагульняюцца высновы, якія зрабілі ўдзельнікі, і прапануецца адказаць на наступныя пытанні:

- Хто і ў якіх мэтах можа выкарыстоўваць стэрэатыпнае ўяўленне пра свет?
- Ці можа гэта ўплываць на эканоміку, палітыку?

Для пацверджання адказаў удзельнікаў настаўнік прыводзіць некалькі прыкладаў пра наступствы, звязаныя са стэрэатыпамі ўспрымання мапаў.

Людзі вельмі лёгка паддаваліся ілюзіям, якія выкарыстоўвалі палітыкі, апелюючы да тых ці іншых картаграфічных праекцый. На Захадзе абывацеля палохалі велізарным Савецкім Саюзам, еўрапейцам падабалася, што Еўропа па памерах амаль роўная ЗША, а прапагандысты лёгка тлумачылі правалы палітыкі ў сельскай гаспадарцы геаграфічным становішчам краіны.

Інфармацыя для даведкі: ЮНЕСКА і ААН карыстаюцца мапай Гала-Петэрса, якая менш скажае рэчаіснасць. Некаторыя краіны, напрыклад, Вялікабрытанія, імкнуцца выкарыстоўваць мапу Гала-Петэрса ў навучальным працэсе.

Спасылкі:

- малюнак 1. Мапа свету ў праекцыі Меркатара (прыклад — «Яндэкс.Карты») https://yandex.by/maps/154/vitebsk/?ll=30.204791%2C55.183672&z=11
- малюнак 2. Сапраўдны памер Грэнландыі https://news.myseldon.com/ru/news/index/215018183

Малюнак 3. Мапа свету ў праекцыі Гала-Петерса на naukas.com
https://businessviews.com.ua/ru/personal-life/id/kak-na-samom-dele-vygljadit-karta-1330/
Малюнак 4. Мапа: «В'етнам на еўрапейскіх шыротах» (мал. 6) на republic.ru
https://republic.ru/posts/l/1119927
Малюнак 5. Мапы свету, створаныя ў розных краінах на marketium.ru
https://lifter.com.ua/karty-mira-v-raznyh-stranah-vyglyadyat-po-raznomu-vot-tolko-7-primerov-3423
Малюнак 6. Мапа «Індэкс свабоды прэсы 2017» арганізацыі «Рэпарцёры без межаў» на rsf.org https://rsf.org/en/ranking/2017

***Парады:***

Перад практыкаваннем трэба падрыхтаваць раздатачны матэрыял: раздрукаваць мапы з пытаннямі для абмеркавання або паказаць пытанні на экране.

Калі ёсць доступ да Інтэрнэту, інтэрактыўная дошка або экран, удзельнікі выконваюць заданне — праходзяць інтэрактыўную гульню-пазл , якая паказвае, як мапа ўводзіць людзей у зман: гульня «Адгадай, якая краіна» дазваляе рухаць краіны і бачыць, як мяняюцца іх памеры. (Калі час заняткаў абмежаваны, гульня можа быць прапанавана ў якасці дамашняга задання.)

У пацверджанне стэрэатыпаў, закладзеных геаграфічнымі мапамі, можна прывесці наступны прыклад: усе сярэднееўрапейскія краіны (Польшча, Украіна, Беларусь, Літва, Славакія і г. д.) маюць на сваёй тэрыторыі кропку (а то і некалькі), якую называюць «геаграфічны цэнтр Еўропы» і возяць туды экскурсіі. Усе гэтыя «цэнтры Еўропы» вызначаюцца на аснове рознага тлумачэння геаграфічных мапаў.

Пры аналізе мапы арганізацыі «Рэпарцёры без межаў» важна звярнуць увагу ўдзельнікаў на каляровую гаму, падабраную для выяваў розных краін. Цёмныя колеры выкарыстаны стваральнікамі мапы, каб адлюстраваць негатыўнае ўспрыманне тых краін, дзе парушаецца свабода слова.

***Аўтар:*** Тамара Мацкевіч

Спасылка на практыкаванне на сайце:
https://medianavigator.org/exercise/129

# БІЯЛОГІЯ

## ФОТАРЭПАРТАЖ

***Медыякампетэнцыі:*** Пошук інфармацыіі. Стварэнне, апрацоўка, прэзентацыя медыяпаведамлення. Інтэрактыўнае ўзаемадзеянне з медыя

Клас 7
***Прадмет:*** Біялогія
***Тэма ўрока:*** Экскурсія «Разнастайнасць лішайнікаў»

***Мэта занятка:***

Асноўнае прызначэнне задання — паказаць навучэнцам магчымасць выкарыстання мабільных тэлефонаў і сацыяльных сетак, інфармацыі з розных крыніц для атрымання новых ведаў і пашырэння ведаў аб біялагічных аб'ектах па тэме ўрока. У рамках вучэбнай праграмы па біялогіі прадугледжана правядзенне ўрокаў-экскурсій, па выніках якіх навучэнцы павінны зрабіць справаздачу. Настаўнік прапануе навучэнцам аформіць справаздачу аб экскурсіі ў дзвюх частках. Першая частка — вучні выконваюць заданні на 7–8 балаў у сшытку. Другая частка, творчае заданне 5 узроўню — зрабіць фотарэпартаж або прэзентацыю.

***Ход занятка:***

Вучні выконваюць заданні ў групах. У ходзе экскурсіі настаўнік прапануе вучням з дапамогай фотакамеры мабільнага тэлефона фатаграфаваць лішайнікі.

Зрабіце фотасправаздачу (прэзентацыю) па наступных крытэрыях:

- Зрабіць па аднаму фота кожнага тыпу лішайніка (накіпны, ліставаты, кусцісты).
- Указаць назву роду.
- Дзе знойдзеныя (ствол дрэва, камень, дах дома і інш.).
- Тып талома.
- Значэнне ў прыродзе.
- Значэнне ў жыцці чалавека.
- Якімі крыніцамі карысталіся для збору інфармацыі і для вызначэння назвы роду, у тым ліку крыніцы інтэрнэт.

• Ці ўся інфармацыя была аднолькавая і як вы дзейнічалі пры супярэчнасцях?

Спасылка:
https://lesschoolvo.nethouse.ru/static/doc/0000/0000/0064/64634.boldevq6yp.pdf

***Парада:***
Практыкаванне можна правесці падчас экускурсій, якія плануюцца згодна патрабаванням вучэбнага прадмета «Біялогія».

***Аўтар:*** Вольга Жыткая

Спасылка на практыкаванне на сайце:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17207

## ПРА ШТО КАЖУЦЬ ПОМНІКІ?

***Медыякампетэнцыі:*** Пошук інфармацыіі. Дэкадаванне медыятэкстаў. Інтэрактыўнае ўзаемадзеянне

Клас 8
***Прадмет:*** Біялогія
***Тэма ўрока:*** Абагульняючае паўтарэнне ( канец навучальнага года)

***Мэта занятка:***
Праца з фотаздымкамі помнікаў жывёлам дапамагае фарміраваць у навучэнцаў 8 класа веды пра значэнне жывёл у прыродзе і жыцці чалавека, прыродаахоўнай дзейнасці чалавека. Акрамя гэтага, навучэнцы вучацца знаходзіць інфармацыю пра помнікі жывёлам, ацэньваць дакладнасць і адпаведнасць інфармацыі.

***Ход заняткаў:***
Урокі праходзяць у канцы года, апошнія ўрокі IV чвэрці, калі ўвесь навучальны матэрыял пройдзены.

Крок 1. Настаўнік прапануе кожнай групе па адным фотаздымку помніка.


Il sauva la vie
à 40 personnes




Схема аналіза:

1. Прапануйце назву помніку.

2. Назавіце жывёлу, дайце характарыстыку знешняй і ўнутранай будовы класа (атрада), дайце класіфікацыю жывёлы.

3. Як вы лічыце, чаму ўсталяваны гэты помнік? У якой краіне (горадзе) ён можа знаходзіцца?

4. З якой мэтай аўтар выкарыстаў менавіта гэту жывёлу? Ці адпавядаюць рысы жывёлы на помніку рэальным біялагічных асаблівасцям жывёлы?

5. Што сімвалізуе помнік? Што хацеў сказаць аўтар помніка? Чаму вы так лічыце?

Крок 2. Настаўнік дае кароткую інфармацыю пра кожны помнік, каб вучні параўналі свае версіі з прапанаванымі фактамі.

Крок 3. Настаўнік паказвае спасылкі, дзе ўзята інфармацыя пра помнік сабаку. Прапануе параўнаць інфармацыю. Ці ёсць адрозненні?

https://ru.wikipedia.org/wiki/Барри_(собака)

http://art.1001chudo.ru/france_1112.html

Крок 4. Настаўнік прыводзіць прыклад пра тое, што інфармацыя ў інтэрнэце бывае супярэчлівай. Прапануе два слайды.

http://5klass.net/mkhk-5-klass/Pamjatniki-zhivotnym/021-Pamjatnik-vorobju.html

https://uslide.ru/okruzhayuschiy-mir/24413-viktorina-chto-za-ptica-vorobey.html

Пытанне: «Чаму на слайдах фота помнікаў розныя, хоць гаворка ідзе аб адным факце?»

На першым слайдзе — помнік Чыжыку-Пыжыку на Фантанцы ў Санкт-Пецярбурзе (Расія), на другім слайдзе — помнік вераб'ю ў Баранавічах (Беларусь).

Выснова, да якой прыйшлі вучні: інфармацыю неабходна правяраць, выкарыстоўваць некалькі сайтаў, інфармацыя на кожным сайце можа адрознівацца, значыць трэба некалькі крыніц, каб скласці больш поўную карціну аб пэўным факце.

Спасылкі:

https://ru.wikipedia.org/wiki/Барри_(собака)

http://art.1001chudo.ru/france_1112.html

https://uslide.ru/okruzhayuschiy-mir/24413-viktorina-chto-za-ptica-vorobey.html

***Парады:***

Праца з фотаздымкамі помнікаў жывёлам дапамагае фарміраваць у вучняў 8 класа веды пра значэнне жывёл у прыродзе і жыцці чалавека, прыродаахоўнай дзейнасці чалавека. Акрамя гэтага, дзеці вучацца знаходзіць інфармацыю пра помнікі жывёлам, ацэньваць дакладнасць і адпаведнасць інфармацыі.

***Аўтар:*** Вольга Жыткая

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17225

# ПАЦВЕРДЗІ АБО АСПРЭЧ

***Медыякампетэнцыі:*** Уменне адрозніваць факты і меркаванні. Распазнаванне фэйкаў і дэзінфармацыі

Клас 8
***Прадмет:*** Біялогія
***Тэма ўрока:*** Асяроддзе пражывання, знешняя будова, шкілет і мускулатура паўзуноў

***Мэта занятка:***

Паказаць вучням, што ў сучасным сеціве трэба вельмі асцярожна ставіцца да фота- і відэавыяў, не забывацца пра крытычнае мысленне і праверку праўдзівасці выкладзеных фактаў.

***Ход заняткаў:***

На аперацыйна-пазнавальным этапе на экране ў пачатку вывучэння тэмы настаўнік паказвае фота і прапануе вучням з дапамогай біялагічных ведаў падцвердзіць праўдзівасць інфармацыі або абвергнуць прадстаўленую інфармацыю. Тэкст, які суправаджае фатаграфію, узяты ў арыгінале, граматычныя памылкі не выпраўленыя. «Самая крупная в мире Анаконда убитая в Джунглях Амазонки — длина её составляет 134 анг. фута (около 40 метров). Она убила 257 людей и 2325 животных».

Ключавое пытанне: «Ці могуць дасягаць такіх памераў паўзуны? Растлумачце з біялагічнага пункту гледжання праўдзівасць або фэйкавасць дадзенага фота».



Вучні абмяркоўваюць фатаграфію ў парах, даюць адказы. Адказы, як правіла, у пачатку ўрока няслушныя, таму што вучням не хапае ведаў. Настаўнік прапануе праверыць правільнасць меркаванняў вучняў падчас вывучэнні тэмы. Настаўнік некалькі разоў звяртаецца да здымка, прапануе вучням выказаць новыя меркаванні. У канцы ўрока настаўнік зноў вяртаецца да выявы. Вучні каментуюць фотаздымак, звязваючы будову жывых арганізмаў і асаблівасці іх жыццядзейнасці, будову органаў і функцыі, якія яны выконваюць. Як правіла, вучні самі выходзяць на правільны адказ.

Высновы, якія павінны зрабіць вучні ў канцы ўрока:

1) нельга давяраць ўсёй інфармацыі, якую размяшчаюць у сацыяльных сетках, яе трэба аналізаваць, каб не даць сябе падмануць, а для гэтага неабходныя біялагічныя веды;

2) пры размяшчэнні інфармацыі чалавек бярэ на сябе адказнасць за яе і не павінен дапускаць граматычных памылак. (У дадзеным выпадку можна правесці работу па выпраўленні граматычных памылак).

Спасылка:
https://ok.ru/normalnost/album/53184242712821/804777806325

***Парады:***

Выкарыстанне фотаздымкаў біялагічных аб’ектаў з сацыяльных сетак «Аднакласнікі», «Фэйсбук», сайтаў навін на ўроках біялогіі наблізіць вашы ўрокі да жыцця, навучыць вучняў крытычна ставіцца да інфармацыі, узятай з гэтых крыніц.

***Аўтар:*** Вольга Жыткая

Спасылка на практыкаванне на сайце:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17211

# АНАТОМІЯ ЭТЫКЕТКІ

***Медыякампетэнцыі:*** Дэкадаванне медыятэкстаў. Распазнаванне маніпуляцый

Клас 9
***Прадмет:*** Біялогія
***Тэма ўрока:*** Сутачны рацыён і рэжым харчавання

***Мэта занятка:***

Вучні будуць ведаць, што рашэнні заўсёды павінны прымацца на аснове актуальнай і дакладнай інфармацыі, будуць умець распазнаваць рэкламныя маніпуляцыі і прымаць усвядомленыя рашэнні пры набыцці прадуктаў харчавання.

***Ход заняткаў:***

Ключавое пытанне: «Якая інфармацыя на этыкетцы выклікае ў вас сумненне? Аргументуйце сваё меркаванне».

Настаўнік знаёміць вучняў з відамі рэкламных маніпуляцый:

- Схаванае ўздзеянне.
- Моўныя маніпуляцыі.
- Дэзінфармацыя.
- Аднабаковая падача інфармацыі.
- Матывы спажывання.
- Праца з падсвядомасцю спажыўца.
- Эмацыйны водгук.
- Лічбы і статыстыка.
- Немагчымасць адказу або абмеркавання.

Усе ідэі абмяркоўваюцца ў групах, запаўняецца табліца. Пасля групавой працы адбываецца абмеркаванне, абмен вынікамі дзейнасці.

Навучэнцы, аналізуючы запоўненую табліцу, робяць выснову аб рэкламных маніпуляцыях, выкарыстаных пры стварэнні этыкеткі дадзенага прадукту:

- скрытае ўздзеянне: яркі колер;
- дэзінфармацыя: абястлушчаная, каларыйнасць, без ГМА;
- моўныя маніпуляцыі: назва «Каша з сякеры», змяшчае клятчатку, не ўтрымлівае халестэрыну;
- матывы спажывання: экалагічна чыстая, без цукру, абястлушчаная.




Спасылкі:
https://docs.google.com/document/d/1A4A4CaMdzMUPZeq3SDQEyMtShh5VHxrNZ5kdRP-Sfrl/edit?folder=0AGXpdxIV2AnOUk9PVA

***Парады:***

Можна арганізаваць працу па аналізе этыкеткі з дапамогай метаду 1 × 2 × 4. Спачатку вучні працуюць індывідуальна, затым у парах, а потым ужо арганізуецца групавая праца, але гэта зойме больш часу. Можна зрабіць практыкаванне як пазакласнае мерапрыемства.

***Аўтар:*** Алена Цілюпа

Спасылка на практыкаванне на сайце:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17220

## ПОСМОТРИ И ОБСУДИ

***Медыякампетэнцыі:*** Уменне адрозніваць факты і меркаванні. Дэкадаванне медыятэкстаў. Распазнаванне маніпуляцый, стэрэатыпаў. Усведамленне ролі і ўплыву медыя

Клас 9
*Прадмет:* Біялогія
*Тэма ўрока:* Гигиена кожи. Принцип закаливания

*Мэта занятка:*
Обратить внимание учащихся на манипуляции, скрытые в любом рекламном ролике по уходу за кожей: реклама шампуня, кремов, очищающих средств).

*Ход заняткаў:*
На этапе закрепления знаний учитель предлагает просмотр рекламы. После просмотра видео учитель предлагает обучающимся обсудить увиденное по схеме анализа медиатекста в парах, четвёрках. Затем организует обсуждение по цепочке согласно схемы анализа. Таким образом обучающиеся учатся слушать друг друга, формулировать и высказывать свою точку зрения.

Схема анализа рекламы:
- С какой целью была выпущена реклама продукта? Что хотели от меня авторы? Кому адресовано послание и почему вы так думаете?
- Полезна ли эта реклама для меня и других людей? Что автор хочет, чтобы я запомнил?
- Кто может получить пользу, а кто вред от этой рекламы?
- Какие идеи, ценности или точки зрения доносят или навязывают? Какой способ используют авторы?
- Могут ли разные люди понять эту рекламу по-разному?
- Как я понял эту рекламу?
- Что я могу сделать: согласиться или высказать своё мнение, применив биологические знания или информацию из различных источников, в т. ч. интернет.
- Можно ли доверять этой рекламе?

Вывод, которые должны сделать учащиеся после работы с рекламой:

1. Критически подходить к информации, которую предлагает реклама.
2. Формировать собственное мнение на данную рекламу.
3. Не всегда доверять имиджу знаменитых людей (уход от стереотипов).

После такого вида работы можно предложить обучающимся следующее домашнее задание на выбор по желанию:

1. Подготовить сообщение «Что такое перхоть, каковы причины её возникновения, что надо делать, чтобы избежать перхоти?»

2. Составьте «Памятку грамотного потребителя продукции по уходу за кожей» ( не менее 5 пунктов, по схеме «Что делать? и Почему (зачем?) так делать»)

Спасылкі:
Реклама Шампунь Clear – Криштиану Роналду 2017 https://www.youtube.com/watch?v=XPbI7iT9Cy0

*Парады:*

Основное содержание данных заданий — просмотр и анализ рекламы и видеоматериалов, связанных с темой урока. Эти задания позволяют закрепить новый материал и показывают значимость биологических знаний в принятии ответственных решений.

*Аўтар:* Житкая Ольга

Спасылка на практыкаванне на сайце:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17241

## ЛАВІ ЛАЙФХАК

*Медыякампетэнцыі:* Крыніцы інфармацыі і іх надзейнасць. Пошук інфармацыіі. Уменне адрозніваць факты і меркаванні. Стварэнне, апрацоўка, прэзентацыя медыяпаведамлення

Клас 9
*Прадмет:* Біялогія
*Тэма ўрока:* Будова і функцыі органаў стрававальнай сістэмы

*Мэта занятка:*

Выкарыстанне лайфхакаў дае магчымасць паказаць вучням, як прымяніць біялагічныя веды пра будову і функцыі органаў і сістэм органаў, будову і функцыі рэчываў (напрыклад, вады, вугляводаў, бялкоў) для фармулявання правілаў гігіены, правілаў вядзення здаровага ладу жыцця.

***Ход заняткаў:***

На пачатку вывучэння новай тэмы ў якасці ключавога пытання настаўнік прапануе лайфхак «Як прадухіліць пякотку? Нягледзячы на тое, што пякотка можа быць выклікана самымі рознымі прычынамі, вы можаце панізіць верагоднасць яе ўзнікнення, калі будзеце спаць на левым баку». Пытанне ў гэтых выпадках можа быць наступным: «Ці варта прыслухоўвацца да гэтай парады і чаму? Патлумачце гэту параду з ужываннем біялагічных ведаў пра будову і функцыі органаў стрававальнай сістэмы».

На этапе задавання дамашняга задання можна прапанаваць вучням стварыць уласны лайфхак.

Спасылкі:
https://lifehacker.ru/heartburn/

***Парады:***

Выкарыстанне лайфхакаў матывуе вучняў набываць біялагічныя веды для праверкі дакладнасці інфармацыі, фарміруе адказнае стаўленне да ўласнага здароўя, уменне прымаць рашэнне па захаванні ўласнага здароўя.

***Аўтар:*** Вольга Жыткая

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17238

# ФІЗІКА

## ФІЗІЧНЫ ПОСТЭР

***Медыякампетэнцыі:*** Пошук інфармацыіі. Веданне мовы медыя. Стварэнне, апрацоўка, прэзентацыя медыяпаведамлення

Клас 7
*Прадмет:* Фізіка
*Тэма ўрока:* Вес тела

***Мэта занятка:***

Совершенствовать умение учеников выделять важную информацию, создавать постеры.

***Ход заняткаў:***

Учитель разбивает класс на группы и определяет роли (вариант: генератор идей, дизайнер, докладчик, критик). Учитель организует изучение нового материала в виде проектной деятельности: озвучивает тему урока, формулирует цели совместно с учащимися, даёт инструкцию.

Каждой группе предлагается план работы:

1. Изучить самостоятельно параграф «Вес тела».
2. Обсудить в группе сходства и различия силы тяжести и веса тела по следующим позициям: определение, направление, точка приложения, модуль.
3. Используя предложенные картинки, создайте постер «Сходства и различия силы тяжести и веса тела» по следующим критериям:

Соотношение текста и картинок 50 % на 50 %.

- Порядок изложения информации (список, таблица, блоки).
- Аккуратность, отсутствие грамматических и физических ошибок.
- Равномерность заполнения листа информацией.
- Наличие заголовка.
- Выделение цветами блоков информации.

4. Подготовиться к презентации постера.

Учитель организует презентацию медиапродукта, задаёт вопросы, при необходимости корректирует, даёт оценку. При наличии времени можно организовать голосование за лучший постер ( за свой не голосуют).



Возможный вариант постера

Спасылкі:
https://www.yaklass.ru/p/fizika/7-klass/dvizhenie-i-vzaimodeistvie-tel-11864/svobodnoe-padenie-ves-tela-11871/re-ca8dd818-da17-44eb-9ee6-58cabff11ff1

***Парады:***
Для разных групп подготовить разные комплекты картинок (фото, рисунки анимационных героев, физического оборудования и др.)

***Аўтары:*** Алена Ананчыкава, Эла Якубоўская, Таццяна Багдановіч

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17244

## ІНФАРМАЦЫЙНЫ ПРАЕКТ

***Медыякампетэнцыі:*** Пошук інфармацыіі. Веданне мовы медыя. Распазнаванне жанраў медыя. Стварэнне, апрацоўка, прэзентацыя медыяпаведамлення

Клас 8
***Прадмет:*** Фізіка
***Тэма ўрока:*** Источники света

***Мэта занятка:***
Создание медиапродукта при осуществлении проектной деятельности.

***Ход заняткаў:***
I. Учитель объединяет учащихся в группы по 4–5 человек, формулирует и поясняет задание, знакомит с критериями оценки.

Создать интеллект-карту, используя «скелет» и предложенные в конверте картинки, согласно следующим критериям:
- созданы элементы 2-го порядка;
- приведены примеры для каждого вида источников света;
- указаны связи между элементами;
- оригинальность оформления;
- приведены примеры не из учебника.

II. Учитель организует работу учащихся по плану:
1. просмотреть материал параграфа;

2. заполнить свою ветку;

3. дополнить ветку интеллект-карты, заполненную другим учеником;

4. определить, кто будет представлять проект.

III. Организует презентации работ, помимо вопросов предметного содержания задает вопросы относительно медиа компетенций: что помогло вам создать медиапродукт; с какими трудностями вы сталкивались; размещая свой продукт в Интернете, что вы должны учитывать, чтобы не нарушить авторские права?

Результатом минипроекта может являтся интеллект карта, представленная на рисунке:

**ИСТОЧНИК СВЕТА**
(тела излучающие свет)

- По типу свечения
  - Тепловые: солнце; пламя свечи; лампа накаливания.
  - Холодного свечения: светлячки; рекламные трубки; морские организмы.
- По размеру
  - Точечные: звезды; лампы уличного освещения.
  - Протяженные: фейверк; пламя факела.
- По происхождению
  - Естественные: звезды; светлячки; атмосферные разряды.
  - Искусственные: пламя свечи; экран телевизова; фары автомобиля.
- По виду превращения энергии в световую
  - Тепловой: свечение бенгальского огня.
  - Химической: фонарик на батарейках.
  - Электрической: лампочка.
  - Световой: раствор флуоресцеина.

Спасылкі:
https://www.xmind.net/download/xmind8/

*Парады:*

Одним из вариантов организации мини-проекта может быть создание учащимися интеллект-карты на уроках изучения нового материала или на уроках повторения и обобщения изученного материала. При использовании мини проектов на уроках изучения нового материала требования к организации урока должны быть следующие: на уроке может быть рассмотрено несколько параграфов учебника, при этом материал должен быть посильный ученикам; рассматривается в основном теоретический материал; должно быть достаточно времени, чтобы учащиеся осуществили проект, создали интеллект карту и смогли презентовать результаты своей работы. Заранее предупредить учащихся принести фломастеры или установить на свои гаджеты (один на группу) программу для создания интеллект-карты.

*Аўтары:* Аляксандр Якубоўскі, Таццяна Афанасік, Таццяна Багдановіч

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17235

## ПОШУК ФІЗІЧНЫХ ПАМЫЛАК У ФІЛЬМЕ

*Медыякампетэнцыі:* Фактчэкінг. Распазнаванне фэйкаў і дэзінфармацыі

Клас 9
*Прадмет:* Фізіка
*Тэма ўрока:* Рашэнне задач па тэме «Закон сусветнага прыцягнення»

*Мэта занятка:*

Вучні шукаюць памылкі і правяраюць дакладнасць інфармацыі ў фільме, выкарыстоўваючы прадметныя веды.

*Ход заняткаў:*

Настаўнік прапануе прагледзець два фрагменты фільма «Гравітацыя» і вызначыць, у чым заключаюцца фізічныя памылкі, якія да-

пусцілі яго аўтары. (Напрыклад, у фільме паведамляецца, што астранаўты знаходзяцца на арбіце, па якой абломкі станцыі рухаюцца да іх (даганяюць астранаўтаў) з скорасцю 80000 км/г, што складае 22,222 км/с і з перыядам 90 хв. Такой сітуацыі быць не можа, бо скорасць абломкаў большая за трэцюю касмічную скорасць і яны не толькі пакінуць арбіту Зямлі, але паляцяць за межы Сонечнай сістэмы, ня вяртаючыся. Таму праз 90 хв. астранаўты не могуць сустрэцца з абломкамі зноў.)

Спасылка:
http://www.nastaunik.info/node/15508

***Парада:***
Выкарыстаць іншыя фільмы ў жанры навуковай фантастыкі.

***Аўтар:*** Аляксандр Якубоўскі

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17217

## ФОКУС АБО РЭЧАІСНАСЦЬ

***Медыякампетэнцыі:*** Фактчэкінг. Роля медыя

Клас 10
***Прадмет:*** Фізіка
***Тэма ўрока:*** Проводники в электростатическом поле

***Мэта занятка:***
Развитие критического мышления, применение теоретических знаний в реальной жизни.

***Ход заняткаў:***
В начале урока учащимся предлагается прсмотреть видеофрагмент «Повелитель молний» и сделать прогноз об увиденном явлении: фокус, монтаж или реальность?

После изучения новой темы учитель возвращается к этому вопосу (можно ещё раз показать фрагмент видео) и организует обсуждение в группах 3 вариантов: фокус, монтаж, реальность. Предлагает

найти доказательства того, что это не монтаж (1 грусппа), не фокус (2 группа), а реальность (3 грусппа), так как используется электростатическая защита. Доказывать, используя знания по теме «Проводники в электрическом поле». Результат представить согласно ПОПС-формуле.

До обсуждения ознакомить учащихся с ПОПС-формулой:

П — позиция (я считаю...)

О — обоснование (потому что...)

П — пример (например, ...)

С — следствие (вывод, что нужно сделать, таким образом...)

Спасылкі:
Тесла шоу «Мегавольт Повелитель молний»
https://youtu.be/PmRf6E-zHek

***Парада:***

Данное упражнение можно использовать как ключевой вопрос.

***Аўтар:*** Алена Ананчыкава

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17222

## ФІЗІКА СУПРАЦЬ РЭКЛАМЫ

***Медыякампетэнцыі:*** Фактчэкінг. Распазнаванне фэйкаў і дэзінфармацыі. Распазнаванне маніпуляцый

Клас 11

***Прадмет:*** Фізіка

***Тэма ўрока:*** Электромагнитные волны. Свойства электромагнитных волн. Шкала.

***Мэта занятка:***

На основе просмотра рекламного ролика медицинского прибора Рикта у учащихся формируется умение анализировать рекламный текст; навык распознавания манипулятивных приемов, используемых в рекламе.

*Ход заняткаў:*

Учитель просит учащихся посмотреть рекламный видеоролик и прочесть текст рекламы. Участники отвечают на вопросы учителя:

- Кто предлагает эту рекламу, кому и с какой целью?
- Вызывает ли у вас доверие «эксперт»?
- Чем можно подтвердить корректность названия устройства — «аппарат квантовой терапии»? Что оно означает?
- Найдите в тексте ошибки из области физики. Что, по вашему мнению, означают термины «квантовая медицина», «полифакторное воздействие», «бактерицидное синее излучение», «экологически безопасные излучения», «постоянное магнитное поле» и «инфракрасный спектр»? В чем новизна этих открытий?
- Каков механизм воздействия электромагнитного поля на организм человека? Может ли это нанести ему вред? Как вы относитесь к рекламе самолечения?

После ответов участников учитель проводит общую дискуссию, чтобы ответить на вопрос: «Что нужно знать, чтобы не попасть под влияние такой рекламы?»

**Ответы на вопросы, связанные с физикой**

1. Чем можно подтвердить правильность названия устройства — «Аппарат квантовой терапии»? Что оно означает?

Кроме надписи на коробке — ничем.

Из теории: «Свет — это поток фотонов, т. е. квантов электромагнитного излучения. Исходя из этого определения, аппаратом квантовой терапии может быть любой источник света: настольная лампа, солнце, свеча…».

2. Найдите ошибки в тексте, которые относятся к физике. Что, по вашему мнению, означают термины «квантовая медицина», «полифакторное воздействие», «бактерицидное синее излучение», «экологически безопасные излучения», в перечне которых упоминается постоянное магнитное поле и инфракрасный спектр?

Синий свет не является бактерицидным, бактерицидным является ультрафиолетовое излучение. Лазерный импульс и есть свет определенной длины волны, излучаемый периодически, а не что-то отдельное. Инфракрасный спектр — это не вид излучения, а его диапазон. Красный и синий цвета являются составляющими белого света, то есть присутствуют в любом естественном излучении (например, сол-

нечном). Синий свет не проникает через кожу, а тем более в район миндалин. Полифакторное воздействие подразумевает сочетание нескольких факторов воздействия. Экологически безопасными являются действия, не наносящие вред окружающей среде. Магнитное поле и инфракрасное излучение могут наносить вред живым организмам при определенных дозах.

3. Каков механизм воздействия электромагнитного поля на организм человека? Может ли оно нанести ему вред? Как вы относитесь к рекламе самолечения?

Электромагнитные поля (за исключением видимого света) человек не видит и не чувствует — и именно поэтому не всегда опасается воздействия этих полей. Электромагнитные излучения оказывают значительное воздействие на организм человека. В крови, являющейся электролитом, под влиянием электромагнитных излучений возникают ионные токи, вызывающие нагрев тканей. При определенной интенсивности излучения, называемой тепловым порогом, организм может не справиться с образующимся теплом.

Нагрев особенно опасен для органов со слаборазвитой сосудистой системой с неинтенсивным кровообращением (глаза, мозг, желудок и др.). Кроме теплового воздействия электромагнитные излучения оказывают неблагоприятное влияние на нервную систему, вызывают нарушение функций сердечно-сосудистой системы, обмена веществ. Степень биологического воздействия электромагнитных полей на организм человека зависит от частоты колебаний, напряженности и интенсивности поля, длительности его воздействия.

Спасылкі:
http://rikta-russia.ru/rikta-ehsmil1a-vityaz.html
https://www.youtube.com/watch?v=6HUiLKWzgXs

***Парада:***

Упражнение целесообразно проводить на этапе закрепления новых знаний.

***Аўтар:*** Эла Якубоўская

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17224

# ПРАЦА З ІНФАГРАФІКАЙ НА ЎРОКАХ ФІЗІКІ

*Медыякампетэнцыі:* Пошук інфармацыіі. Веданне мовы медыя

Клас 11
*Прадмет:* Фізіка
*Тэма ўрока:* Ядзерная мадэль атама

*Мэта занятка:*
Развіваць уменне вучняў вычляняць важную інфармацыю, падаваць гэту інфармацыю ў выглядзе інфаграфікі.

*Ход заняткаў:*
Інфаграфіка як адзін з метадаў візуалізацыі вучэбнай інфармацыі можа выкарыстоўвацца на вучэбных занятках для стварэння праблемных сітуацый і арганізацыі эфектыўнай пошукавай дзейнасці.

На першым этапе настаўнік можа прадэманстраваць гатовую інфаграфіку, а потым папрасіць вучняў вылучыць: тэзіс, мэту, праблему, якую адлюстроўвае дадзеная інфаграфіка.

На другім этапе настаўнік размяркоўвае паміж вучнямі ролі. Ролі могуць мяняцца ў залежнасці ад прапанаванай для аналізу візуальнай інфармацыі. Потым просіць прааналізаваць інфаграфіку з пункту гледжання сваёй ролі.

Магчымы апошні этап: настаўнік просіць навучэнцаў стварыць уласную інфаграфіку. Пры стварэнні ўласнай Інфаграфікі вучні павінны мець выхад у інтэрнет і ўмець працаваць з сэрвісам http://www.easel.ly/.

Настаўнік прапануе вучням алгарытм працы:

1-ы крок — вызначыце мэты і задачы, якія неабходна дасягнуць з дапамогай інфаграфікі.

2-і крок — разбіце інфармацыю на раздзелы, часткі, пункты. Кожны раздзел ўявіце асобным малюнкам або графікам. Падбярыце патрэбныя візуальныя вобразы, якія знаёмыя і часта выкарыстоўваюцца вашай аўдыторыяй.

3-і крок — стварыце фокус, гэта значыць прыдумайце гісторыю, асноўную візуальную метафару, вакол якой будзе будавацца інфаграфіка. Яна павінна быць простай і ўсім вядомай.

Прыклад інфаграфікі, створанай вучнямі. Тэма: «Выбітныя навукоўцы і іх адкрыцці ў ядзернай фізіцы». Інфаграфіка была створана з дапамогай сэрвіса http://www.easel.ly/.




Спасылкі:
http://www.easel.ly/
http://www.nastaunik.info/node/15999

*Парада:*

Дадзены від дзейнасці можна прымяняць на ўроку вывучэння новага матэрыялу або ў якасці дамашняга задання.

*Аўтар:* Аляксандр Якубоўскі

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17243

# ЦІ ВЕДАЮЦЬ ФІЗІКУ АЎТАРЫ ФІЛЬМА «ЛЮБОВЬ-МОРКОВЬ 2»?

*Медыякампетэнцыі:* Вызначэнні надзейнасці крыніц інфармацыі. Фактчэкінг. Дэкадаванне медыятэкстаў

Клас 11
*Прадмет:* Фізіка
*Тэма ўрока:* Закон праламлення святла. Паказчык праламлення

*Мэта занятка:*
Практыкаванне скіравана на фарміраванне ў вучняў звычкі крытычна ацэньваць пададзеную відэаінфармацыю, а таксама прымяняць веды па фізіцы ў жыццёвых сітуацыях.

*Ход заняткаў:*
Заданне. Праглядзіце фрагмент фільма «Любовь-морковь 2» (з 10-й па 13-ю хвіліны). У фрагменце паказана, як дыямент (алмаз) апускаюць у шклянку з вадой, і ён становіцца нябачным. Насамрэч, паказчык праламлення дыямента і вады маюць розныя велічыні (1,42 і 1,33 адпаведна), таму дыямент не можа быць незаўважным у вадзе.
Адкажыце на пытанні:
- Ці ёсць тут фізічная памылка? Калі ёсць, то ў чым яна заключаецца?
- Як абгрунтаваць, што ў фрагменце з алмазам ёсць фізічная памылка?
- Магчыма аўтары свядома зрабілі памылку? Калі так, то навошта яны гэта зрабілі?
- Якія высновы вы зрабілі для сябе з паказанага ў фільме сюжэта?

Спасылкі:
Фільм «Любовь морковь 2»
https://youtu.be/STS9r2CCUfg

*Парады:*
Гэты фрагмент мэтазгодна паказаць двойчы. Першы раз — пасля агучвання першага пытання. Вывучаецца новы матэрыял, а за-

тым вучні ў групах, а потым франтальна абмяркоўваюць астатнія тры пытанні.

*Аўтар:* Мікалай Запрудскі

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17256

# ХІМІЯ

## АЛЬДЭГІДЫ Ў МАСТАЦКІХ ТЭКСТАХ І РЭКЛАМЕ

*Медыякампетэнцыі:* Крыніцы інфармацыі і іх надзейнасць. Пошук інфармацыіі

Клас 10
*Прадмет:* Хімія
*Тэма ўрока:* Альдэгіды. Апошні ўрок па тэме

*Мэта занятка:*
Праверыць праўдзівасць сцвярджэнняў пра альдэгіды ў рэкламных тэкстах.

*Ход заняткаў:*
Настаўнік прапануе вызначыць, якім чынам мы выкарыстоўваем альдэгіды ў побыце. Вучні абмяркоўваюць у парах, агучваюць свае меркаванні.

Пытанні для абмеркавання:
1. Парфумамі мы карыстаемся кожны дзень. Як мы вызначаемся з выбарам сродкаў догляду за сабой? Прывядзіце прыклады. (Правіла непадымання рукі.)
Калі вучні не прапануюць уплыў рэкламы (што мала верагодна), то настаўнік можа падказаць.

2. Якую мэту маюць вытворцы прадукту і стваральнікі рэкламы? З дапамогай якіх прыёмаў яны пераконваюць нас у неабходнасці набыцця тавару? Адказы на гэтыя пытанні вы даведаецеся, калі паглядзіце рэкламны ролік «One Direction — ‹Our Moment› Fragrance Ad» (гл. спасылку 1).

Пасля прагляду рэкламнага роліка вучні адзначаюць прыёмы пераканання, якія пабачылі ў рэкламе.

Самаправерка, агучванне вынікаў.

Настаўнік прапануе ўзгадаць, як называецца спецыяліст, які прафесійна займаецца стварэннем парфумаў? (Правіла непадымання рукі.)

Высвятляецца, хто чытаў раман «Парфюмер» Патрыка Зюскінда альбо глядзеў яго экранізацыю.

Прагляд урыўка з фільма «Парфумер» пад назвай «Гэта не чалавек! Гэта Анёл!» (гл. спасылку 2).

Пытанні для абмеркавання фрагменту фільма.

- Хто галоўны герой і што ён робіць?
- Куды накіраваны погляд людзей на плошчы?
- Якія эмоцыі адчуваць людзі?
- Чаму ўрывак фільма мае назву «Гэта не чалавек! Гэта Анёл!»?
- З якімі ўласцівасцямі звязана выкарыстанне парфумаў і распаўсюджванне пахаў?

Вучні агучваюць адказы (правіла непадымання рукі).

Настаўнік прапануе ўзгадаць уласцівасці і спосабы атрымання альдэгідаў.

Спасылкі:

- «One Direction — ‹Our Moment› Fragrance Ad»: https://www.youtube.com/watch?v=7fNuTf76FIE
- Урывак з фільма «Парфумер»: https://youtu.be/dPzIMbEDXp0

***Парада:***

У якасці дамашняга задання можна прапанаваць скласці спіс альдэгідаў, якія прысутнічаюць у доме, адзначыць, для чаго яны выкарыстоўваюцца.

***Аўтар:*** Артур Алейнік

Спасылка на практыкаванне на сайце:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/16846

# ВЫХАВАЎЧАЯ РАБОТА
# (класныя і інфармацыйныя гадзіны)

## РЭКЛАМА & РЭЧАІСНАСЦЬ

***Медыякампетэнцыі:***

Поошук інфармацыі і праверка надзейнасці крыніц. Распазнаванне маніпуляцый. Распазнаванне рэкламы і прапаганды

Класы 1–4

***Мэта занятка:***

Аналіз рэкламы

***Ход заняткаў:***

Вучням дэманструецца карцінка рэкламнай выявы гамбургера з Макдоналдса і выява прадукта, якую рэальна атрымоўвае пакупнік. Настаўнік прапануе задумацца, чаму рэкламная карцінка выглядае не так, як сапраўдная.

У пачатку занятка дзеці дзеляцца на групы. Настаўнік дае мэтавую ўстаноўку: чаму рэкламная карцінка выглядае не так, як сапраўдная. Яшчэ ён паведамляе пра тое, што тэму занятка вучні самі сфармулююць напрыканцы занятку. Вучням дэманструецца карцінка рэкламнай выявы гамбургера з Макдоналдса і выява прадукта, якую рэальна атрымоўвае пакупнік. Настаўнік прапаноўвае пытанні групам, і накіроўвае працу груп. Шэраг пытанняў, якія навучэнцы абмяркоўваюць ў групах.

Выява 1 (рэкламная)



Выява 2 (рэальная)






1. Што вы бачыце?
2. Чаму прадукт выглядае па-іншаму?
3. Дзе можна сустрэць выяву, якая выглядае апетытна і прывабна?
4. З якой мэтай ствараюцца рэкламныя выявы?
5. Заданне: ад кожнай каманды скласці па адной парадзе — што трэба рабіць (ці як паводзіць сябе), каб не трапіць на рэкламныя хітрыкі.

Пасля практыкавання настаўнік прапануе вучням самім сфармуляваць тэму, якой быў прысвечаны занятак.

Спасылка:
https://www.publy.ru/post/18091

***Парады:***

Працу з рэкламай у пачатковай школе можна арганізаваць па-рознаму. Напрыклад, даць заданне праверыць, ці пацвярджаюцца факты, паказаныя ў рэкламным роліку. Калі дзеці безвынікова спрабавалі насыціць напоем Nestle кацяня, яны задумаліся, што не ўсё, што паказана ў рэкламе можа быць праўдай.

***Аўтар:*** Святлана Локіс

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17215

# КЛАСНАЯ ГАДЗІНА «КАЛІ ВУЧЫЦЦА НЕ ХОЧАЦЦА»

*Медыякампетэнцыі:* Дэкадаванне медыятэкстаў. Авалоданне мовай медыя. Распазнаванне жанраў медыя

Класы 4–6

*Мэта занятка:*

Дапамагчы вучням асэнсаваць уласную адказнасць за сваё навучанне

*Ход заняткаў:*

1. Праца ў групах «Ці патрэбна дамашняе заданне?»

Сутнасць працы: вучні індывідуальна пішуць выказванне, якое потым абмяркоўваецца ў групе і прэзентуецца для ўсіх.

2. Аналіз і дэкадаванне мультфільма «Лянота вучыцца»

Настаўнік прапануе прагледзець мультфільм.

Арганізуе першасны аналіз відэатэксту:

- Хто галоўны герой / героі?
- Чым займаюцца?
- Што адбываецца з героямі напрыканцы?
- Аб чым гэты мультфільм?

Настаўнік арганізуе паўторны прагляд мультфільма і работу груп (абмяркоўваем і пішам разам, але кожны вучань павінен адказаць толькі на адно пытанне падчас прэзентацыі).

1 група: назірае за гукамі ў мультфільме:

- Якія гукі падабраныя для дзяўчынкі, лялькі?
- Якія гукі выкарыстоўваюцца для стварэння адпаведнага настрою, выкліку эмоцый?
- Якія спадарожныя гукі ёсць ў фрагменце? Для чаго яны патрэбныя?

2 група: аналізуе карцінку (візуальныя вобразы):

- З дапамогай якіх сродкаў паказаны характар дзяўчынкі?
- Што адчувае лялька, калі яе застаюць знянацку за выкананнем задання?
- З дапамогай якіх элементаў гэта паказана?
- Як праяўляюцца эмоцыі дзяўчынкі пасля выкананых заданняў і атрыманых адзнак?
- Ці падабаецца дзяўчынцы вучыцца? Ці падабаецца вучыцца ляльцы? Як гэта паказана ў мультфільме?

- Пра што хацеў сказаць аўтар, калі памяняў ролямі ляльку і дзяўчынку?

3 група: аналізуе прызначэнне і характар тэксту:

- Для каго прызначаны тэкст?
- З дапамогай чаго аўтар ўздзейнічае на аўдыторыю?
- Аб чым тэкст?
- Якія сродкі выкарыстоўваюць аўтары відэа, каб данесці сэнс?

Настаўнік арганізуе прэзентацыю работы груп.

Прапануе звярнуцца да сваіх лістоў і адказаць на пытанне: Ці змянілася ваша меркаванне пра тое, для чаго патрэбныя мультфільмы?

Спасылкі:
Лень учиться. Короткометражный мультфильм
https://youtu.be/jWKZJuE1RP0?list=PLMCz3c6IwCA4f18Mo5TxcBEVQ0-4N4-0k

*Парада:*

Папрасіць дзяцей паўторна выказацца пра неабходнасць дамашняга задання.

*Аўтар:* Святлана Іванюшына

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17206

## СТВАРЭННЕ ПОДПІСУ ДА МЕМА

*Медыякампетэнцыі:* Разуменне мовы медыя. Распазнаванне жанраў медыя

Стварэнне, апрацоўка, прэзентацыя медыяпаведамлення.

Класы 5–11

*Мэта занятка:*

Вучні спрабуюць зрабіць уласны медыятэкст (мем з вірусным эфектам)

*Ход заняткаў:*

Абсталяванне: прыклады вядомага мема з рознымі подпісамі, «чысты» (без подпісаў) варыянт карцінкі мема.




Крыніца https://www.meme-arsenal.com/create/meme/325365

Прыклад мема.

Настаўнік расказвае гісторыю ўзнікнення пэўнага мема, дэманструе прыклады розных подпісаў пад адной і той жа карцінкай (гл. спасылкі) і прапануе вучням стварыць свой варыянт подпісу пад вядомай карцінкай. Напрыклад: «Настаўніца вінаваціць вучняў, што яны шумяць і не працуюць». — «Адзіны вучань, які моўчкі старанна робіць заданне».

Напрыканцы практыкавання можна абмеркаваць пытанні:

1) Што такое вірусны кантэнт у Інтэрнэце?

(Паведамленні у сетках, якія распаўсюджваюцца ад чалавека да чалавека, як вірус)

2) У якіх мэтах ствараюцца мемы і іншыя паведамленні, якія мы распаўсюджваем як вірус?

(Рэкламных, палітычных, прапагадысцкіх, забаўляльных...)

3) Як вы лічыце, у якой выявы больш шанцаў стаць мемам?

(Непрадказальна, мемамі робяцца самыя розныя выявы, аднак большыя шанцы ў фота вядомых людзей, пацешных звяроў).

Спасылкі:
https://tjournal.ru/internet/103599-mem-dve-zhenshchiny-orut-na-ozadachennogo-kota-za-stolom
https://leonardo.osnova.io/f7dcc4d1-4645-4ebc-0838-f59754e3c257/
https://leonardo.osnova.io/93d09dd7-3d10-9251-4c3b-8f88017cd915/

*Парады:*
У выпадку адсутнасці магчымасці выхаду ў Інтэрнэт ці навыкаў работы дзяцей у графічных рэдактарах можна скарыстацца раздрукоўкамі мема, выканаць надпіс ад рукі і зрабіць яго фотаздымак. Пры рабоце з мемамі трэба быць гатовымі да прысутнасці вялікай колькасці непрымальнага для выкарыстання ў школе кантэнту.

*Аўтар:* Лера Сом

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17218

# НАВЯЗАНАЯ ПРЫГАЖОСЦЬ

*Медыякампетэнцыі:* Распазнаванне маніпуляцый. Стэрыатыпы

Класы 5–9
*Мэта занятка:*
На прыкладах з рэкламы вучні даведаюцца аб ролі медыя ў стварэнні і навязванні ідэалаў прыгажосці, змогуць распазнаваць маніпуляцыі ў рэкламе, зразумеюць тэхналогіі стварэння рэкламнага прадукту

*Ход заняткаў:*
Настаўнік задае некалькі пытанняў, якія маюць 4 варыянты адказаў. Кожны з варыянтаў адпавядае таблічцы з колерам (на дошцы / фліпчарце), а ў кожным з кутоў пакоя прымацавана па адным з прапанаваных колераў (метад «4 куты»). Удзельнікі стаяць у цэнтры памяшкання: калі зачытваецца пытанне з варыянтамі адказаў, яны ідуць у той кут, які адпавядае іх выбару.
Для ўвядзення ў тэму «Што такое прыгажосць?» пытанні могуць быць наступнымі:

1) Прыгожы чалавек — гэта той, хто ...
• мае добрую прычоску і якасны макіяж (чырвоны колер);
• модна апранаецца (жоўты);
• мае правільныя рысы твару (сіні);
• сочыць за сваёй знешнасцю і здароўем (зялёны).

2) Прыгожых людзей я часцей за ўсё бачу ...
• на тэлебачанні;
• у глянцавых часопісах;
• у Інтэрнэце;
• у штодзённым жыцці.

3) Чалавек, які рэкламуе тавар, павінен быць ...
• фотамадэллю;
• акцёрам;
• экспертам у дадзенай галіне;
• звычайным чалавекам.

Настаўнік прапануе вучням скласці топ-10 прыгожых людзей, запісвае прапанаваныя адказы на дошцы або паперы і звяртае ўвагу ўдзельнікаў на тое, што да гэтага спісу яны вернуцца.

Яны праглядаюць відэаролік, які паказвае тэхналогію стварэння рэкламы (гл. спасылка 1), і абмяркоўваюць яго. Настаўнік прапануе правесці мазгавы штурм на тэму: «Якая галоўная ідэя роліка?» і аб’ядноўвае удзельнікаў у 4 групы. Кожная з іх павінна даць адказ на пытанне, запісаць або намаляваць свае адказы на вялікім аркушы паперы і зрабіць прэзентацыю па выніках працы групы.

Пытанні:
• Якія існуюць стэрэатыпы прыгажосці?
• Якую ролю ў «трансляцыі ідэальнага ладу» адыгрываюць медыя?
• Складнікі сапраўднай прыгажосці — гэта ...
• Прывядзіце прыклады маніпуляцый медыя свядомасцю людзей.

Групам даецца 10 хвілін на працу.

Прэзентацыя вынікаў ад прадстаўнікоў груп — таксама 10 хвілін. Астатнія ўдзельнікі могуць задаць пытанні і выказаць свае меркаванні па тэме.

Настаўнік вяртаецца да спісу, які быў зроблены ў пачатку (з вялікай верагоднасцю ў ім апынуцца зоркі кіно і эстрады) і задае пытанні аўдыторыі:
• Ці ўплываюць на нас мас-медыя?
• Ці не навязваюцца нам гэтыя вобразы?

- А што яшчэ нам прапануюць любіць, есці, купляць?
- Ці заўсёды тое, што нам прапануюць, — сапраўды лепшы варыянт?

У канцы можна прывесці прыклады, якія пацвярджаюць высновы ўдзельнікаў. Вось адзін з іх.

Барбі стала эталонам прыгажосці для многіх дзяўчынак. Паводле разлікаў спецыялістаў, калі б Барбі была чалавекам, то пры росце 170 см яна б важыла крыху менш за 50 кг, аб'ём грудзей быў бы 99 см, таліі — 45 см, сцёгнаў — 84 см. З такімі прапорцыямі ў жанчыны было б шмат праблем не толькі з рэпрадуктыўным здароўем, але і з балансам. Тым не менш, амерыканка Сіндзі Джэксан зрабіла дзясяткі пластычных аперацый, каб быць падобнай на Барбі. У выніку ад яе ранейшага выгляду засталася толькі ніжняя губа. Яна трапіла ў Кнігу рэкордаў Гінэса, аднак эталонам прыгажосці так і не стала.

Спасылкі:
See Why We Have An Absolutely Ridiculous Standard Of Beauty In Just 37 Seconds:
https://www.youtube.com/watch?v=k55bm2Z3I08
https://www.youtube.com/watch?v=iYhCn0jf46U

***Парада:***

Прапануйце ў якасці дамашняга задання адшукаць выявы, якія лічыліся эталонамі прыгажосці ў Сярэднявеччы і эпоху Адраджэння.

***Аўтар:*** Вера Мацкевіч

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17214

# E.S.C.A.P.E.

***Медыякампетэнцыі:*** Пошук інфармацыіі. Надзейнасць крыніц інфармацыі. Навінавая пісьменнасць

Класы 8–11
***Мэта занятка:***
Прывучыць вучняў правяраць атрыманую інфармацыю

*Ход заняткаў:*

Запытайцеся ў вучняў, якім чынам яны вызначаюць, што інфармацыя, якую яны знаходзяць у Інтэрнэце, надзейная.

Увядзіце E.S.C.A.P.E. абрэвіятуру (гл. постэр), напісаўшы шэсць ключавых паняццяў на дошцы альбо прэзентуючы плакат.



Падзяліце вучняў на групы, раздайце лісты (спасылка або Дадатак 1) і дайце спасылку на абраную навіну (ці артыкул па тэме, якая актуальная для вучняў ці тэмы ўрока). Кожнай групе трэба будзе прааналізаваць навіну і запоўніць ліст.

Прапануйце групам падзяліцца сваімі высновамі. Усе разам вырашыце, ці з'яўляецца гісторыя фэйкам або не.

АБМЕРКАВАННЕ

1) Прымяняючы толькі адзін пункт з E.S.C.A.P.E., вы маглі б вызначыцца з надзейнасцю гэтай гісторыі? Чаму так ці чаму не?

2) Якое з гэтых пунктаў вы лічыце найбольш карысным у высвятленні таго, наколькі інфармацыя надзейная? Чаму?

3) Які з гэтых пунктаў вы лічыце найбольш складаным для разумення альбо прымянення? Чаму?

4) Ці адчувалі вы, што ў вас дастаткова часу, каб прымяніць E.S.C.A.P.E. да гэтай гісторыі? Як у рэальным жыцці вы маглі б паскорыць працэс ацэнкі інфармацыі?

Спасылкі:
https://drive.google.com/file/d/1JyBZPrGRwHOC_nOh1IaoCBXEjqy9ILIc/view?fbclid=IwAR0yc5HuT2H9ILZJuIotE6vzmjUaQuVbVSYoPu6OynI-3BK7VYX3ji7_hU0
http://www.nastaunik.info/sites/default/files/page/files/list_0.docx

***Парада:***

Практыкаванне прыдатнае для ўрока англійскай мовы, а таксама для трэнінгаў па навіннай пісьменнасці для дарослых.

***Аўтар:*** Таццяна Фадзіна

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17296

Дадатак 1
Імя:
Дата:

E.S.C.A.P.E. Junk News
**E → Evidence (ДОКАЗ)**

Ваша навіна (назва):

*Выберыце тры важныя факты з гэтай гісторыі. Факты могуць быць назвамі, удзельнікамі канкрэтнай падзеі, цытатай, фатаграфіяй ці любым іншым фактарам, які падмацоўвае гісторыю.*

Факт 1:

Факт 2:

Факт 3:

*Пацвердзіце гэтыя факты. Іншымі словамі, знайдзіце іншую крыніцу, якая б самастойна паведаміла пра той жа факт (а не гісторыю, якая спасылаецца на гісторыю, якая ў вас ужо ёсць). Пералічыце іншыя крыніцы, якія альбо пацвярджаюць, альбо супярэчаць кожнаму факту.*

Факт 1: Пацверджаны? ТАК / НЕ
Крыніца:

Факт 2: Пацверджаны? ТАК / НЕ
Крыніца:

Факт 3: Пацверджаны? ТАК / НЕ
Крыніца:

*Зыходзячы з гэтага хуткага расследавання, як вы лічыце, ці раскрыты факты ў гэтай гісторыі? ТАК / НЕ*

*Растлумачце:*

**S → Source (КРЫНІЦА)**

*Адшукайце наступную інфармацыю для вашай навіны:*

1. Выдавец (сайт ці арганізацыя, якая прадаставіла прастору для гэтай гісторыі)

2. Аўтар(ы) (імя і прафесія чалавека альбо людзей, якія гэта напісалі)

3. Крыніцы інфармацыі, на якія спасылаюцца ў гэтай гісторыі (чалавек, дакумент ці іншая крыніца)

*Выкарыстоўваючы шкалу 1–10, дзе 1 — «зусім не», а 10 — «вельмі моцна», наколькі вы давяраеце гэтай крыніцы, каб даць дакладную інфармацыю па тэме вашай навіны?*

1. Выдавец 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10
*Растлумачце свой рэйтынг. (Напрыклад: я ніколі не чуў пра гэтую крыніцу і вэб-сайт выглядае танна)*

2. Аўтар(ы) 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10
*Растлумачце свой рэйтынг.*

3. Спасылкі на крыніцы 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10
*Растлумачце свой рэйтынг.*

*У цэлым, вы лічыце крыніцу інфармацыі надзейнай? ТАК / НЕ*
*Растлумачце:*

**C → Context (КАНТЭКСТ)**

Якая галоўная праблема альбо падзея ў гэтай гісторыі?

*Знайдзіце і прачытайце яшчэ дзве крыніцы пра тую ж праблему ці падзею.*

Назва крыніцы:
Публікацыя або вэб-сайт:

Назва крыніцы 2:
Публікацыя або вэб-сайт:

*Для кожнай дадатковай крыніцы адкажыце на наступнае пытанне: ці прадстаўляла гэтая крыніца якую-небудзь новую ці іншую інфармацыю пра падзею / праблему?*

Крыніца 1 ТАК / НЕ
Растлумачце:

Крыніца 2 ТАК / НЕ
Растлумачце:

Зыходзячы з гэтага хуткага расследавання, як вы лічыце: ваша першапачатковая навіна разгледжана з усіх бакоў ці гэта толькі фрагмент пэўнай гісторыі?
Растлумачце:

**A → Audience (АЎДЫТОРЫЯ)**

Публікацыя / вэб-сайт:

*Паглядзіце ўважліва на вашу навіну і яе публікацыю / вэб-сайт і адкажыце на наступныя пытанні:*
1.Што паведамляе выданне / назва сайта пра мэтавую аўдыторыю?

2. Што тэкст навіны распавядае пра мэтавую аўдыторыю? (Напрыклад, складаны слоўнікавы запас альбо незвычайныя тэрміны могуць указваць на тое, што артыкул прызначаны для добра адукаванай аўдыторыі.)

3. Што іншы змест у публікацыі / на сайце распавядае пра мэтавую аўдыторыю? (Напрыклад, ці часта яны пішуць пра пэўныя групы ці інтарэсы?)

4. Зыходзячы з вышэйзгаданых адказаў, апішыце тып ці тыпы людзей, якія складаюць аўдыторыю для гэтай гісторыі:

5. Як вы лічыце, ці сфарміравала мэтавая публіка змест гэтай гісторыі? Іншымі словамі, ці аўтар альбо выдавец змяніў, апусціў або

перакруціў што-небудзь у гісторыі, каб звярнуцца да пэўнай групы? ТАК / НЕ

Растлумачце:

**P → Purpose (МЭТА)**

*Шукайце наступныя магчымыя мэты ў вашай навіне і растлумачце, чаму вы лічыце, што кожная з іх ёсць ці не ўжываецца.*

1. Ці было мэтай гэтай гісторыі пазнаёміць альбо паведаміць людзям пра падзею / праблему? (Магчымыя падказкі: падрабязныя факты і надзейныя крыніцы, поўная інфармацыя па тэме) ТАК / НЕ

Растлумачце:

2. Ці было мэтай гэтай гісторыі зарабіць грошы аўтару альбо выдавецтву? (Магчымыя падказкі: рэклама вакол гісторыі, заклікі да грошай / падтрымкі) ТАК / НЕ

Растлумачце:

3. Ці стваралася гэтая гісторыя, каб паўплываць на тое, як хтосьці адчувае гэтую падзею / праблему? (Магчымыя падказкі: меркаванні, моцна эмацыйная мова, пахвала ці крытыка для ключавых асоб ці груп, якія ўдзельнічаюць у падзеі ці праблеме) ТАК / НЕ

Растлумачце:

*З трох пералічаных вышэй мэтаў, якую вы лічыце галоўнай мэтай гэтай гісторыі і чаму? (Ці, калі вы лічыце, што мэта іншая, то растлумачце.)*

*Зыходзячы з вышэйзгаданых адказаў пра мэты, як вы лічыце, ці можна давяраць гэтай гісторыі? ТАК / НЕ*

*Растлумачце:*

**E → Execution (ВЫКАНАННЕ)**

*Па шкале ад 1 да 10, калі 1 — «дрэнна зроблены» і 10 — «вельмі прафесійна», ацаніце кожны з наступных элементаў вашай гісторыі:*

1. Яснасць (здольнасць аўтара выразна прадстаўляць інфармацыю)
1 2 3 4 5 6 7 8 9 10
Растлумачце свой рэйтынг. *(Напрыклад: я палічыў гэтую гісторыю вельмі заблытанай)*

2. Стыль (тон аўтара і магчымасць прыцягнуць чытача)
1 2 3 4 5 6 7 8 9 10
Растлумачце свой рэйтынг. *(Напрыклад: я палічыў гэтую гісторыю вельмі сумнай і нецікавай.)*

3. Граматыка, памылкі друку і арфаграфія (тэхнічныя здольнасці аўтара)
1 2 3 4 5 6 7 8 9 10
Растлумачце свой рэйтынг. *(Напрыклад: я знайшоў шмат няпоўных сказаў)*

4. Макет / фармат (як выглядае гісторыя)
1 2 3 4 5 6 7 8 9 10
Растлумачце свой рэйтынг. *(Напрыклад: старонка добра арганізавана і зручная для чытання)*

*Зыходзячы з вышэйзгаданых адказаў, як вы лічыце, ці можна давяраць гэтай гісторыі? ТАК / НЕ*
*Растлумачце:*

# ІНФАРМАЦЫЯ І ПРАПАГАНДА Ў САЦЫЯЛЬНАЙ РЭКЛАМЕ

***Медыякампетэнцыі:*** Распазнаванне інфармавання, рэкламы і прапаганды. Этыка і журналісцкія стандарты. Стварэнне, апрацоўка, прэзентацыя медыяпаведамлення

Класы 8–11

*Мэта занятка:*

Вучні змогуць адрозніць інфармаванне ад прапаганды ў сацыяльнай рэкламе

*Ход заняткаў:*

Прапануйце вучням паглядзець два відэаролікі сацыяльнай рэкламы з аднолькавым пасылам: засцерагчы людзей ад каранавірусу. Скажыце, што адзін ролік — прыклад інфармавання, а другі — прыклад прапаганды. Але не агучвайце, якое відэа да якога тыпу адносіцца. Вучні павінны самі гэта вызначыць.

Папрасіце вучняў абмеркаваць у парах (30 секунд) і выказацца, які ролік яны лічаць інфармацыйным, а які — прапагандай. І чаму. Пацвердзіце, што яны вызначыліся правільна. Звярніце ўвагу, што прапагандысцкія ролікі часта парушаюць этычныя нормы, каб выклікаць моцныя эмоцыі і знізіць крытычнасць мыслення. (У дадзеным ролiку бабуля разрываецца на кавалкі і разлятаецца, як лопнуты паветраны шарык).

Аб'яднайце вучняў у групы па 4–7 чалавек. Раздайце вучням карткі з словамі:

Паведамляе

Інфармуе

Вытлумачвае

Тлумачыць

Вучыць

Пераконвае

Заклікае

Агітуе

Уздзейнічае на эмоцыі

Уплывае

Намаўляе (дзейнічаць пэўным чынам, дае гатовыя рашэнні)

Маніпулюе

Папрасіце іх вызначыць, якія паняцці больш адпавядаюць інфармаванню, а якія — прапагандзе.

Групы наклейваюць стыкеры са словамі на дошку.

Калі ўзнікнуць спрэчныя моманты — настаўнік тлумачыць, што, напрыклад, інфармаванне сустракаецца і ў інфармацыйным і ў прапагандысцкім ролiку, але інфармацыя падаецца па-рознаму. У інфармацыйным — праз аргументаванне і тлумачэнне, а ў прапа-

гандысцкім — праз маніпуляванне (эмоцыямі, лічбамі, «экспертным» меркаваннем...).

Інфармацыйны ролік — інфармуе, тлумачыць і вучыць.

Прапагандысцкі — інфармуе і дае гатовае рашэнне.

Настаўнік зачытвае азначэнне, што такое сацыяльная рэклама:

«Сацыяльная рэклама — від некамерцыйнай рэкламы, скіраванай на змену грамадскіх паводзін і прыцягнення ўвагі да праблем грамадства.»

Настаўнік просіць групы прыдумаць сцэнар сацыяльнай рэкламы. Прычым адны групы будуць рабіць сцэнар прапагандысцкага роліка, а іншыя — інфармацыйнага. (Гэта заданне можа быць дадзена ў якасці дамашняга, калі час не дазваляе зрабіць гэта ў класе).

Крытэрыі ацэнкі працы груп:

- Ці была выбрана праблема, сапраўды важная для грамадства
- Ці патлумачаны метады, якія выбраны для пераканання важнасці гэтай праблемы

Спасылкі:
https://youtu.be/7aFUZ3FpVJw; https://youtu.be/xgJcbkdHAHA

***Парада:***
Можна адабраць ролікі па іншых актуальных тэмах

***Аўтар:*** Тамара Мацкевіч

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17457

## АРГУМЕНТАЦЫЯ І ЛОГІКА

***Медыякампетэнцыі:*** Крыніцы інфармацыі і іх надзейнасць. Уменне адрозніваць факты і меркаванні. Фактчэкінг. Распазнаванне фэйкаў і дэзінфармацыі. Навінная пісьменнасць. Інтэрактыўнае ўзаемадзеянне з медыя

Класы 9–11

***Мэта занятка:***

Развіццё крытычнага мыслення, умення ацэньваць і рабіць адказны выбар

*Ход заняткаў:*

Настаўнік задае пытанне:

— Якія асноўныя элементы, на Ваш погляд, павінна ўтрымліваць у сабе аргументаванае выказванне? (Запісваем на дошцы і абмяркоўваем).

Міні-ўрок па структуры аргумента:

- Што такое аргумент і яго структура?
- Аргумент — гэта сцвярджэнне, з дапамогай якога вылучаецца ідэя, правільная пабудова якога дапамагае пераканаць у правільнасці ідэі.
- Аргумент будуецца па сістэме — СТПЗ — сцверджанне, тлумачэнне, падтрымка, заключэнне.
- Сцвержанне — вылучаецца ідэя, думка.
- Тлумачэнне — даецца тлумачэнне заяўлення, якое пачынаецца са слоў «таму, што ...»
- Падтрымка — доказы заяўлення ў выглядзе фактаў, цытат першакрыніц, статыстычных дадзеных, меркаванняў экспертаў у гэтай галіне, з дапамогай логікі.
- Заключэнне — выснова. Звычайна пачынаецца са слоў «такім чынам ...», «робячы выснову ...», і ў канцы абавязкова паўтараецца заяўленне.

Напрыклад:

С: Сёння я не пайду гуляць на вуліцу;

Т: Таму што вельмі холадна;

П: на https://www.gismeteo.by/ перадавалі аранжавы ўзровень небяспекі, моцнае пахаладанне да –15 °С і снегапад, а я не падрыхтаваў(ла) зімовую вопратку;

З: Такім чынам, каб не змерзнуць і не захварэць, я не пайду на вуліцу.

Клас дзеліцца на мікрагрупы. Кожнай групе настаўнік прапануе тэмы для вылучэння аргументаваных выказванняў:

1) Навучанне праз практычную дзейнасць станоўча ўплывае на дасягненні вучняў.

2) Прагляд тэлевізара звыш 10 гадзін у тыдзень прыносіць больш шкоды, чым карысці.

3) Інтэрнэт-крыніцы неабходна правяраць.

4) Зваротная сувязь на ўроку павышае акадэмічную паспяховасць вучняў.

Спасылка:
https://press-club.by/kanspekty/kak-uvelichit-dolyu-nacionalnogo-kontenta-v-belarusskih-smi-konspekt-mediatoka

***Парады:***

Практыкаванне можа выкарыстоўвацца як у дарослай аўдыторыі, так і ў працы з вучнямі сярэдняга і старэйшага ўзросту на ўроках гуманітарнага, прыродазнаўчага цыклу, класнай і інфармацыйнай гадзінах. Адаптацыя практыкавання з кнігі: Грудзинская Е. Ю., Марико В. В. Активные методы обучения в высшей школе. Учебно-методические материалы по программе повышения квалификации «Современные педагогические и информационные технологии». — Нижний Новгород, 2007, 182 с.

***Аўтар адаптацыі:*** Алена Радзевіч

Спасылка на практыкаванне: http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17197

## РЫТАРЫЧНЫ ТРОХКУТНІК

***Медыякампетэнцыі:*** Уменне адрозніваць факты і меркаванні. Дэкадаванне медыятэкстаў. Мова медыя. Жанры медыя

Класы 5–7

***Мэта занятка:***

Мэтанакіраванае вывучэнне фота і графікі дапамагае актуалізаваць здольнасці вучняў да аналізу і паказвае, як візуальныя матэрыялы ўздзейнічаюць на ўспрыманне, ацэнку і перакананні людзей

***Ход заняткаў:***

Настаўнік прапануе вучням разгледзець фота і прачытаць подпісы пад імі. Пасля таго, як навучэнцы разгледзелі фатаграфіі, робіцца абмеркаванне фота з пазіцыі таго, якія загалоўкі і тэкст іх суправаджаюць. Абапірайцемся на наступныя крокі:

Прааналізуйце фота па рытарычным трохкутніку:

- Хто з'яўляецца дзеючай (галоўнай) на фотаздымку асобай (хто кажа, выступае)?
- Хто з'яўляецца аўдыторыяй?

- Які асноўны пасыл дзеючай асобы да аўдыторыі? Ці адпавядае тэкст, подпіс пад фота візуальным невербальным сімвалам (поза, эмоцыі, мова цела)?

Падумайце, які мэсыдж/пасыл закладзены ў гэтым фота? Якія сродкі дапамагаюць «паверыць» дзеючай асобе? Наколькі фота спрыяе прыняццю пункту гледжання дзеючай асобы?

Спасылкі:
https://news.tut.by/go/665179.html
https://udf.by/news/tech/203533-4g-zarabotaet-v-polnuju-silu-a1-dogovorilis-s-becloud.html

*Парады:*

Практыкаванне накіравана на развіццё візуальнай пісьменнасці. Яго можна правесці на класнай і інфармацыйнай гадзінах. Можна прааналізаваць фота, размешчаныя ў газеце, навінных рэпартажах у інтэрнэце. Аўтары: Caitrin Blake, B.A. in English and Sociology (University of Vermont), master's degree in English literature (University of Colorado Denver), teaches composition at Arapahoe Community College Крыніца online.cune.edu

*Аўтар адаптацыі:* Алена Радзевіч

Спасылка на практыкаванне:
http://www.nastaunik.info/mediatoolkit/exercise/17229

# ЗМЕСТ


Нам ёсць чаму вучыцца адзін у аднаго ........ 3

**ПАЧАТКОВАЯ ШКОЛА**

Жыццё дзікіх жывёл зімой ........ 4
Почва. Свойства почвы ........ 6
Ад батлейкі да паланэза ........ 7

**МОВА**

Творчыя дамашнія заданні ........ 8
Глядзі ў корань! (аднакаранёвыя словы) ........ 9

**ЛІТАРАТУРА**

Творчыя дамашнія заданні ........ 11
Старонка героя ........ 12
Урывак з паэмы Л. Случаніна «Рагнеда». Вобраз Рагнеды ........ 13
Параўнальны аналіз вобраза Рагнеды на прыкладзе твораў літаратуры і юбілейнай манеты ........ 16
Факты і меркаванні ў нашых падручніках ........ 17
Тарас на Парнасе ........ 18
Шукаем твары ........ 19
Знайдзі цытату — адгадай аўтара. А. Хадановіч «Гатэль Беларусь» ........ 20

**ЗАМЕЖНАЯ МОВА**

Чый гэта пакой? ........ 23
Знешнасць чалавека і характар ........ 24
Знешнасць. Праца з фотаздымкам і відэаролікам ........ 26
Дэкадаванне рэкламы. Тэма «У краме» ........ 27
Picture Dictation ........ 29
Якой павінна быць якасная рэклама? ........ 30

**ІНФАРМАТЫКА**

Основные сервисы Интернета, их назначение ........ 32
Ці ведаеце вы, што? ........ 34
Создаем базу данных «Реклама в нашей жизни» ........ 35

**ГІСТОРЫЯ**

Помнік як навіна ........ 36
Вікіпедыя як крыніца інфармацыі ........ 38
Карыкатуры і плакаты часоў Першай сусветнай вайны ........ 39

Палітычная карыкатура часоў Першай сусветнай вайны ........................41
Постэр ці трэйлер як падагульненне вывучанай тэмы...........................43
Трэйлер гістарычнага фільма для мэтавызначэння ................................45

**ГРАМАДАЗНАЎСТВА**

Будучыня чалавецтва ................................................................................46
Сацыяльны партрэт Беларусі ..................................................................47

**ГЕАГРАФІЯ**

Без меры няма веры, або Як намі маніпулююць геаграфічныя мапы ........................................................................................................49

**БІЯЛОГІЯ**

Фотарэпартаж ...........................................................................................54
Пра што кажуць помнікі? .........................................................................55
Пацвердзі або аспрэч ...............................................................................58
Анатомія этыкеткі.....................................................................................60
Посмотри и обсуди ...................................................................................61
Лаві лайфхак .............................................................................................63

**ФІЗІКА**

Фізічны постэр...........................................................................................64
Інфармацыйны праект .............................................................................66
Пошук фізічных памылак у фільме..........................................................68
Фокус або рэчаіснасць..............................................................................69
Фізіка супраць рэкламы...........................................................................70
Праца з інфаграфікай на ўроках фізікі...................................................73
Ці ведаюць фізіку аўтары фільма «Любовь-морковь 2»?.......................75

**ХІМІЯ**

Альдэгіды ў мастацкіх тэкстах і рэкламе ...............................................76
ВЫХАВАЎЧАЯ РАБОТА (класныя і інфармацыйныя гадзіны)..................78
Рэклама & рэчаіснасць .............................................................................78
Класная гадзіна «Калі вучыцца не хочацца» ..........................................80
Стварэнне подпісу да мема ....................................................................81
Навязаная прыгажосць ............................................................................83
E.S.C.A.P.E. ................................................................................................85
Інфармацыя і прапаганда ў сацыяльнай рэкламе..................................92
Аргументацыя і логіка...............................................................................94
Рытарычны трохкутнік .............................................................................96

Навукова-папулярнае выданне

# MEDIAToolkit:
# практыкаванні
# для фармавання медыяпісьменнасці

Адказны за выпуск *У. М. Сіўчыкаў*
Рэдактар *Т. П. Мацкевіч*
Мастацкі рэдактар *В. М. Багачэнка*

Пры афармленні кнігі выкарыстаны ілюстрацыі:
Delpixel, SaliVit, ID1974 / Shutterstock.com

На вокладцы выкарыстана ілюстрацыя:
VLADGRIN / Shutterstock.com
Выкарыстана па ліцэнзіі ад Shutterstock.com

Падпісана да друку 25.06.2020.
Фармат 60×84/16.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 6,24. Ул-выд. арк. 5,68.
Наклад 200 ас. Замова ____.

Індывідуальны прадпрымальнік Сіўчыкаў Уладзімір Мікалаевіч.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюдніка друкаваных выданняў ад 24.04.2014 за № 1/325.
Праспект Незалежнасці, 72–12, 220012, г. Мінск.
siuchykau@gmail.com

Надрукавана ў друкарні ТАА «Палікрафт».
Вул. Кнорына, 50, 220103, г. Мінск.
Ліц №02330/466 ад 21.04.2014 г.